ДЭМАНСТРАЦЫЯ АДЗІНСТВА ЭНТУЗІЯЗМУ, ВОЛІ І АДДАНАСЬЦІ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЕ ЗА ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ—ПЯЦІГОДКУ ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БЯСКЛЯСАВАГА ГРАМАДЗТВА

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 25 1933 г. № 113 (4657)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ШЛЯХ ДА ЗАМОЖНАГА ЖЫЦЬЦЯ

1.433.557 гэктараў засеяла наша рэспубліка да 20 мая. **ПЛЯН ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 55,1 ПРОЦ.** Апошняя пяцілетка прынесла зьнижэньне тэмпаў. **ЗУСІМ ГАНЕБНА, ЗУСІМ НЕДАПУШЧАЛЬНЫ ВЫНІКІ!** Дэмабілізацыйныя настроі, стаўка на самацёк—вось у чым прычыны такога становішча.

Няма ніякага апраўданьня такім зусім невыстарчальным тэмпам сяўбы. Мы можам і абавязаны ва што-б там ні стала ў тэрмін і добра завяршыць сяўбу—ні на дзень пазьней, ні на гэктар менш— і гэтым самым зрабіць гігантскі крок наперад па шляху да заможнага калгаснага жыцьця.

Перамогі нашых перадавых раёнаў на фронце веснавой сяўбы—перамогі бальшавікоў, калгасьнікаў і працоўных адна асобнікаў **ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЫ І СЛУЦКУ**—яркая і характэрная ілюстрацыя.

Іх вопыт—пераканаўчы дакумант тых крокаў, якія адбыліся ў сьвядомасьці калгаснага сялянства, у іх адносінах да калгаснай працы, тых вынікаў, якія забясьпечвае кампэтэнтнае бальшавіцкае кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю.

Наша партыя дамагалася таго, што цяпер былыя беднякі ў калгасах жывуць ня горш за сераднякоў.

Але гэтага мала. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб зрабіць яшчэ адзін крок наперад, каб ажыцьцявіць лістарычны лёзунг тав. Сталіна.

— Зрабіць усіх калгасьнікаў—і былых беднякоў, і былых сераднякоў—**ЗАМОЖНЫМІ!**

Шлях да заможнага калгаснага жыцьця адкрыт. Уся справа толькі ў тым, каб да канца выкарыстаць з калгасаў кулацкія і шкодніцкія элементы, каб працаваць сумленна і пільна, як вожа берагчы калгаснае дабро, каб ахоўваць сьвяшчэнную грамадзкую ўласнасьць.

І Чырвоная Слабада, і Слуцак пічым асабліва не адрозьніваюцца па ўмовах работы ад іншых рабнаў нашай рэспублікі. Магчымасьці па сушнасьці адны і тыя-ж.

У чым-жа справа? Чаму Чырвоная Слабада і Слуцак першымі ў БССР засеялі, і добра засеялі, усе яравыя?

Чырвонаслабодзкія і слуцкія бальшавікі цьвёрда ўсьвядомілі і на практыцы ажыцьцяўляюць указаньне тав. Сталіна аб калкрэтным кіраўніцтве калгаснай вытворчасьцю, аб такім кіраўніцтве, якое ўваходзіць ва ўсе дэталі, ва ўсе дробязі калгаснай гаспадаркі, якое глыбока захапляе ўсе пытаньні калгаснага жыцьця:

«... Калгасны лад не зьмяншае, а павялічвае клопаты і адказнасьць партыі і ўраду ў адносінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі... Партыя, калі яна хоча кіраваць калгасным рухам, павінна ўваходзіць ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця і калгаснага кіраўніцтва» (І. Сталін).

У полі, у брыгадах і зьвенынях, у дзе сліцідворках аднаасобнікаў—вось дзе скаяцэнтравана работа чырвонаслабодзкай і слуцкай партарганізацый, работа райкомаў і палітаддзелаў.

Усе формы, усе мэтады партыйна-масавай работы перанесены сюды—у рашаючае зьвяно калгаснай вытворчасьці—брыгады, у гушчу калгасных і працоўных аднаасобных мас.

Самі калгасьнікі вылучылі са сваіх радоў сотні, тысячы ізатавых калгаснай вытворчасьці, такіх калгасьнікаў-ударнікаў, такіх работнікаў-арганізатараў, якія раней былі толькі на нашых фабрыках і заводах.

Партарганізацыі Чырвонай Слабады і Слуцку вырасталі з гэтых людзей моцны і надзейны актыў, апіраючыся на які яны разгарнулі сапраўды баявую бальшавіцкую работу сярод усіх калгасьнікаў.

Вопыт лепшых—адстаючым, калгасьнік—ударнік, адказвай ня толькі за сябе, адказвай і за сваіх суседаў—гэты лёзунг ператвараецца ў Чырвонай Слабадзе і Слуцку ў жывую, творчую справу.

Брыгада правярала брыгаду. Перадавы калгас браў на буксір суседа, які адставаў. Калгасьнік-ударнік падцягваў таварыша да рабоце, на баразьне, зьвяну, гону.

Лёзунг сацыялістычнага спаборніцтва з **ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ**, лёзунг барацьбы за пяршынства, за ўдарную і сумленную працу стаў здабыткам мас, іх кроўнай справай.

Паглядзеце хоць-бы, як спаборнічалі з сабой калгасы **«КІМ»** і **«ПРАМЕНЬ»** у Чырвонай Слабадзе.

Брыгада аднаго калгасу прыяжджала на палі брыгады другога і пільна правярала, як узоран і засеян кожны гэктар, ці няма агрэхаў, ці няма прасеваў, пропускаў на полі. Яркі, пераканаўчы факт росту сьвядомасьці калгасных мас, іх жаданьня працаваць сумленна, працаваць на сябе, на свае калгасы, яркі паказальнік сілы ленінскага спаборніцтва.

Або другі характэрнейшы прыклад. Гутарка ідзе пра канавы. Дажджы спачатку сяўбы затапілі частку слуцкіх палёў. Слуцкія камуністы, слуцкія калгасьнікі не замяшаліся, не апусьцілі рук. Пракапалі канавы, спусьцілі ваду, глеба хутка падсохла і раньнія тэрміны сяўбы былі вытрыманы.

Клясавы вораг, недабітыя рэшткі кулацтва шалёна імкнуцца сарваць сяўбу, разваліць калгасную вытворчасьць.

Бальшавікі Слуцку і Чырвонай Слабады, рашуча ачышчаючы свае рады ад апартуністычных элемэнтаў, ад пераражэнцаў—агентаў клясавага ворага, сапраўды мабілізавалі калгасныя масы і працоўных аднаасобнікаў на бязьлітасную барацьбу з кулаком.

Кулацка-шкодніцкія элемэнты рашуча выганяюцца з калгасаў. Гэта і зьяўляецца адным з самых асноўных і рашаючых прычын посьпеху Слуцку і Чырвонай Слабады на пасеўнай.

Аднак—**НІЯКАГА СУПАКАЕНЬНЯ!** Дасягнуты толькі першыя вынікі. Вораг яшчэ не дабіт, вораг з патроенай энэргіяй аказвае заядлае супраціўленьне.

З яшчэ большай рашучасьцю выкрываць і вышыбаць кулацкае ахвосьце з калгасаў, дабіць кулака, ізаляваць нашых ворагаў—вось у чым задача.

Аднаасобнік—наш заўтрашні калгасьнік. Яго нельга скідваць з рахунку. Чырвоная Слабада паказвае як трэба працаваць з аднаасобнікам.

Папулярызацыя новага закону аб пастаўцы збожжа дзяржаве, своячасовая перадача абавязацельстваў, канкрэтная і практычная дапамога ў сяўбе, вылучэньне спэцыяльных агранаўпаўважаных—адным словам, штодзённая масава-палітычная і арганізатарская работа сярод аднаасобнікаў—далі свае бліскучыя вынікі. Яравыя поўнасьцю і ў тэрмін засеяны.

На калгасных палёх Слуцку і Чырвонай Слабады зазеляненелі густыя і роўныя ўсходы. Своячасовая сяўба і высокая якасьць палівных работ гарантуюць высокі ўраджай.

Папярэднія падлікі гавораць пра най вялікшы вынік. Слуцкія і чырвонаслабодзкія калгасьнікі атрымаюць у гэтым годзе пасьля здачы збожжа дзяржаве і ссыпкі аднаведных фондаў у некалькі раз **ВЫШЭЙШЫ ДАХОД.** Калгасьнікі перадавых калгасаў **УЖО СТАНОВЯЦЦА ЗАМОЖНЫМІ.**

Вопыт Случчыны, вопыт Чырвонай Слабады—прыклад усім нашым раёнам. Няма ніякага апраўданьня таму, што наша рэспубліка ў цэлым ганебна адстала з сяўбой. Плян пакуль выканан толькі на 55,1 проц. Дасягнуты вынік рэзка адстае ад нашых магчымасьцяй.

Нельга цярпець далей гэтага адставаньня! За сяўбу трэба змагацца так, як слуцкія і чырвонаслабодзкія бальшавікі.

Удзесяцярыць тэмпы, павысіць якасьць, заваяваць пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю—справа гонару КП(б)Б, усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў БССР. А гэта можна і трэба ва што-б там ні стала зрабіць. Прыклад Слуцку і Чырвонай Слабады—пераканаўчы довад.

Вышэй тэмпы, вышэй якасьць! Усе сілы, усю волю—на неадкладнае завяршэньне сяўбы.

Бальшавікім правядзеньнем сяўбы, сумленнай працай на калгасных палёх, рашучай і непрымірымай барацьбой з клясавым ворагам—даб'ёмся поўнай перамогі на пасеўным фронце, зробім рашаючы крок наперад на шляху да заможнага калгаснага жыцьця!

ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН СКОНЧЫЎ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ КУЛЬТУР

ЖЫТКАВІЧЫ, 24. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА СПЭЦКОРА)

ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН СКОНЧЫЎ СЯЎБУ ЯРАВЫХ. ПЛЯН ВЫКАНАН НА 100,6 ПРОЦ. РАЗГОРТВАЕЦЦА БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПАСЕЎНАГА ЗАДАНЬНЯ КОЖНЫМ КАЛГАСАМ І КОЖНАЙ АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКАЙ.

ГАЛКІН.

СЬВЯТА ПЕРАМОГ

Да стадыёну падыходзяць усё новыя і новыя калёны пралетараў Менску. Ідуць мэталісты, чыгуначнікі, дрэваапрацоўшчыкі, друкары, гарбары, абутнікі... Кожны сьвяткуе перамогу працоўных на фінансавым фронце.

Трамвай—дзеціпча першай пяцігодкі—перапоўнены. Усе спяшаюцца на стадыён.

Месцы на вышках, якія разьмеркаваны па саюзах ці, правільней, па вытворчых аб'яднаньнях, хутка запаўняюцца людзьмі. Стракацяць блакітныя, паласатыя, ружовыя майкі, розпакаляровыя джэмпры, жакеты, белыя, чорныя, залочытныя кашулі, чырвоныя хустачкі...

Сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. **Кудзелька** абвяшчае мітынг адкрытым. На трыбуну ўзыходзяць т. т. **Гікало, Лычоў, Бэнэк, Горын, Картукоў, Кавальчук і інш., прадстаўнікі Чырвонай арміі на чале з правадыром і арганізатарам чырвонай коньніцы тав. БУДЗЁННЫМ.**

— Працоўныя Менску выканалі плян рэалізацыі пазыкі—гаворыць тав. Кудзелька.—Працоўныя Менску гэтым самым яшчэ лішні раз паказалі, што пралетары Савецкага саюзу будуюць і пабудуюць сацыялізм сваімі ўласнымі сіламі і сродкамі.

Слова даецца загадчыку аргаддзелу ЦК КП(б)Б тав. **Картукову.** Ён коратка спыняецца на тых задачах, якія стаяць перад працоўнымі Менску, як і перад працоўнымі ўсёй БССР, і заключае, не аслабляючы бальшавіцкіх тэм паў, а ўмацняючы іх, змагацца па ўсіх участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва з такім-жа запалам, з такой-жа энэргіяй, як яны змагаліся за выкананьне рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі.

Слова Будзённаму.

Прамова тав. **Будзённага** была спатканая гучнымі апляўдысмэнтамі пяцітысячнай масы працоўных сталіцы БССР—Менску.

— Вы падводзіце вынікі—гаворыць тав. **Будзённы**—праведзенай валізарнейшай работы па рэалізацыі пазыкі. Вашы посьпехі ёсьць новая перамога другой пяцігодкі. Ваша краіна—Савецкая Беларусь—зьяўляецца дзяржавай, на якую зварачаецца ўвага ўсіх саюзных рэспублік, бо яна зьяўляецца авангардам СССР па рубяжы з капіталістычным сьветам. Вашы перамогі, ёсьць перамогі, якія маюць усесаюзнае значэньне. Яны радуюць працоўных усяго Савецкага саюзу.

Прамова тав. Будзённага штомінутна перапыняецца бурнымі воплескамі, якія пераходзяць у авацыю.

... Адзін за другім узыходзяць на трыбуну перадавыя прадпрыемствы і рапартуюць аб перамогах, якіх яны дабіліся ў справе рэалізацыі пазыкі, якімі формамі і мэтадамі яны праводзілі гэту работу.

Варашылаўцы выканалі плян рэалізацыі пазыкі на працягу трох дзён на 111 проц., ахапіўшы падпіскай увесь калектыў рабочых...

Рабочы калектыў заводу **«Бальшавік»** свой абавязак перад пралетарскай дзяржавай выканаў. Рабочыя добра ведаюць, што мы можам разьлічваць толькі на свае ўласныя сілы і таму ўсе як адзін падпісаліся на пазыку другой пяцігодкі...

Рапартуюць прадпрыемствы **«Камунар», вагонабудаўнічы завод імя Мясьнікова, «Камунарка», «Кастрычнік», Менскі чыгуначны вузел** і інш.

Ад Акадэміі Навук Беларусі рапартуе прэзыдэнт Акадэміі тав. **Горын.** —Акадэмія Навук Беларусі—кажа т. Горын—перабудавала сваю работу за ўсіх галіпах і зараз ідзе ў першых радох побач з перадавымі прадпрыемствамі, і ў рэалізацыі пазыкі. Яна дала ў пазыку дзяржаве 121 проц. месячнага заработку.

Ад байцоў нач. і палітскладу №-скай кавдывізіі імя энгельскага пралетарыяту рапартуе тав. **Нікіценка** аб тым, што пазыкай ахоплены ўсе байцы, начскład, і палітработнікі дывізіі ў разьмеры 139 проц. заработку.

Сярод лепшых аказаўся машына будаўнічы завод імя Варашылава. **Яму прысудзілі пераходны сьцяг за лепшую рэалізацыю пазыкі.**

Слова прадастаўляецца тав. **Башмачнікаву** для зачытаньня рэзалюцыі мітынгу, якая заслухоўваецца з вялікай увагай усёй масай працоўных.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. Кудзелька ставіць рэзалюцыю на галасаваньне.

Тысячы рук узьняліся на ўсім стадыёне.

ЗА — уся працоўная маса. Яна, не пакладаючы рук, пад сьцягам ЛЕНІНА, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на чале з яе любімым правадыром тав. СТАЛІНЫМ будзе змагацца за далейшыя перамогі.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ УЗОРНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПАРТАКТЫВУ гор. МЕНСКУ ПА ДАКЛАДУ тав. ЛЫЧОВА АБ ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

Заслухаўшы даклад т. ЛЫЧОВА аб чыстцы партыі, сход партыйнага актыву г. Менску горача вітае пастанову ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб правядзеньні генэральнай чысткі партыі, як мерапрыемства, накіраванага да яшчэ большага ўмацаваньня несакрушальных радоў партыі—кіруючай сілы пралетарскай дыктатуры.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на чале з яе ленінскім ЦК і правадыром партыі тав. СТАЛІНЫМ рабочая кляса з вялікім посьпехам завяршыла першую пяцігодку за чатыры гады.

Краіна Саветаў пад кіраўніцтвам партыі ўступіла ў другую пяцігодку—пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Пасьпяховае вырашэньне задач другой пяцігодкі нямысліма без далейшага ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту. «Моцная і магутная дыктатура пралетарыяту — вось што нам трэба цяпер для таго, каб разьвеяць у прах апошнія рэшткі паміраючых клясаў» (СТАЛІН).

Агульны сход партактыву гор. Менску адзначае, што побач з вялізарнымі посьпехамі, дасягнутымі партыяй на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, побач з буйным ростам і згуртаванасьцю адзінства волі партыі, у асобных зьвенях некаторых партарганізацый КП(б)Б наглядаецца страта клясавай пільнасьці, невыстарчальная ўстойлівасьць і апартуністычны самасупакой.

Шкодніцтва ў апаратах і сыстэмах Наркамзему і Трактарацэнтру, буйныя палітычныя прарывы ў Наркамасьсветы, у Наркамаховы здароўя, Наркамюсьце, раскрадваньне і разбазарваньне дзяржаўнай маемасьці ў Белдзяржснабе, Лесбеле, Белмапако і інш., рад трацкісцкіх і бундаўскіх выпадзін у на вуковых установах (Рыўлін, Засьценкер, Чарняўскі), скажэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі (справа Сьцяпуры, Бабаяна, Бабчонка), нацдэмаўскія выпазкі ў літаратуры (Сідарэнка, Барановых і інш.)—усё гэта сьведчыць аб тым, што цэлым радам партыйных арганізацый вялася невыстарчальная барацьба за генэральную лінію партыі, за ачышчэньне партыйных радоў ад пераражэнскіх, двурушніцкіх і клясава-чужых элемэнтаў.

Недыходзячая чыстка партыі павінна вызваліць КП(б)Б ад клясава-чужых і варожых элемэнтаў, двурушнікаў, пераражэнцаў, апартуністаў, шкурнікаў і кар'ерыстаў, ад бюракратаў і маральна разлажыўшыхся людзей, якія свае дзеяньні прыкрываюць партыйным білетам. Чыстка павінна нанесьці рашучы ўдар па ўсіх тых, якія хістаюцца і рэвізуюць генэральную лінію партыі і, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам, скажаюць ленінскую нацыянальную палітыку, прабуюць пра цягваць трацкісцкія, бундаўскія, нацдэмаўскія і іншыя антыпартыйныя ідзі і погляды ў асяродзішча нашай партыі.

Чыстка павінна яшчэ больш згуртаваць рады партыі і ўзьняць палітычны ўзровень кожнага камуніста, умацаваць жалезную дысцыпліну радоў партыі. Асабліва вялікае значэньне чыстка яшчэ і таму, што значная частка членаў і кандыдатаў партыі будуць праходзіць яе ўпяршыню.

Чыстка партыі павінна ўзьняць ідэйную ўзброенасьць кожнага камуніста.

Партактыў прапануе парт'ячэйкам узмацніць работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні і ўзбраеньні палітычнымі ведамі членаў і кандыдатаў партыі.

Чыстка партыі павінна праводзіцца з пункту гледжаньня правёркі таго, як кожны камуніст выконвае даручаную яму партыяй справу, як ён змагаецца за выкананьне прамфінпляну, за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, як ён змагаецца за якасьць, які ён прымае ўдзел у сацспаборніцтве і ўдарніцтве, як ён змагаецца за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы, за выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, за ўмацаваньне калгасаў і саўгасаў. Чыстка павінна быць ператворана ў магутны сродак барацьбы за лепшае выкананьне гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад партыяй.

Сход партактыву падкрэсьлівае асаблівую важнасьць разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы» як пры падрыхтоўцы да чыстки, так і пры яе правядзеньні, пры цягваючы самыя шырокія беспартыйныя масы да чыстки.

Па-бальшавіцку крытыкуючы работу партыйных ячэек і асобных камуністаў, рашуча выкарчоўваючы недахопы ў іх рабоце, неабходна «даваць рашучы адпор тым, хто будзе прабаваць выкарыстаць чыстку ў мэтах зьвядзеньня асабістых рахункаў, у мэтах групавой барацьбы, усім склочнікам і паклёпнікам, а таксама тым, хто папрабуе ашальмаваць камуніста за цьвёрдасьць правядзеньня ім лініі партыі ў барацьбе за партыйную дысцыпліну, рэжым эканоміі, выкананьне прамфінпляну, своячасовае выкананьне збожжазагатовак, правільную падрыхтоўку да веснавой сяўбы, уборкі і разьмеркавань ня ўраджаю і наогул за цьвёрдасьць у адносінах дакладнасьці і выразнасьці работы партыйцаў, падначаленых таму ці іншаму таварышу, як кіраўніку. У той-жа час павінен быць дан ня менш рашучы адпор тым, хто будзе шальмаваць склочнікамі і паклёпнікамі ўсіх, хто шчыра імкнецца дапамагчы партыі выявіць у часе чыстки чужыя, няўстойлівыя, ненадзейныя элемэнты ў яе радох або ўказаць на сапраўдныя ўпушчэньні, недахопы, памылкі і праступкі ў рабоце таго ці іншага таварыша або цэлай арганізацыі» (з пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Сход партактыву гор. Менску лічыць, што праведзеная да гэтага часу работа па папулярызацыі сярод шырокіх мас камуністаў і беспартыйных задач чыстки партыі зусім невыстарчальная, што партмасавая і растлумачальная работа па чыстцы партыі яшчэ не дайшла да цэху і зьвяна. У абмеркаваньне задач чыстки партыі ня ўцягнуты яшчэ ў належнай меры радавыя члены і кандыдаты партыі і беспартыйныя рабочыя. Неабходна ў бліжэйшыя дні шырэй разгарнуць работу па падрыхтоўцы да чыстки.

Надаючы асабліва буйнае значэньне асьвятленьню пытаньняў чыстки ў друку, радакцыі цэнтральных і фабрычна-заводзкіх газэт павінны зараз-жа мабілізаваць усе рабкораўскія і селькораўскія сілы і арганізаваць штодзённае асьвятленьне на стороннах друку ня толькі падрыхтоўчай работы ячэек, але і таго, наколькі чыстка і падрыхтоўка да яе дапамагае кожнаму прадпрыемству, кожнаму калгасу, кожнаму сельсавету, кожнай установе выявіць і зжыць свае недахопы і мабілізаваць працоўныя масы на павышэньне ўдарных тэмпаў і якасьці работы.

Ачышчаючы свае рады ад усіх апартуністычных і няўстойлівых элемэнтаў, яшчэ цясьней згуртоўваючы свае рады вакол ленінскага ЦК і правадыра партыі т. Сталіна, партыя яшчэ больш умацуе адзінства і маналітнасьць сваіх радоў, павысіць ідэалёгічны ўзровень кожнага камуніста і прывядзе рабочую клясу да перамогі сацыялізму.

Аб ходзе падрыхтоўкі да чысткі партыі па Менскай партарганізацыі

Пастанова сакратарыяту ГК і прэзыдыуму ГарКК ад 24 мая 1933 г.

Праведзеная ГК і ГКК праверка ходу падрыхтоўкі парт'ячэек да чысткі партыі паказала, што побач з асобнымі парткалектывамі (фабрыка «Кастрычнік», завод імя Мясьнікова), якія сапраўды зразумелі ўсю палітычную важнасьць рашэньня ЦК аб чыстцы і са ўсёй сур'ёзнасьцю падыйшлі да падрыхтоўкі арганізацыі чысткі партыі, многія парткалектывы і ячэйкі абмежаваліся фармальным абгаварэньнем гэтага пытаньня, не разгарнуўшы масавай работы вакол гэтай важнейшай задачы партыі.

Для ажыцьцяўленьня задач, канкрэтна вызначаных у пастанове ЦК і ЦКК ад 28 студзеня і інструкцыі цэнтральнай камісіі па чыстцы партыі, сакратарыят ГК і прэзыдыум ГарКК пастанаўляюць:

1. 27 мая правесьці па ўсіх парт'ячэйках гарадзкой і вясковай партарганізацыі чарговы партдзень, прысьвечаны абгаварэньню пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 28 красавіка і інструкцыі цэнтральнай камісіі па чыстцы партыі.

Партсходы павінны быць адкрытымі з забесьпячэньнем шырокай прысутнасьці і ўдзелу камсамолу і беспартыйных.

2. Ускласьці на сакратароў парт'ячэек, упаўнаважаных ГК па сяўбе і нач. палітаддзелаў МТС і саўгасаў адказнасьць за глыбокую прапрацоўку пастановы партыі аб чыстцы на адкрытых партсходах саўгасаў, калгасаў і МТС, шырока прыцягнуўшы беспартыйных актыў рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і камсамолу.

3. Аргаддзелу ГК, парткалегіі ГарКК і сакратарам парт'ячэек да 1 чэрвеня правесьці праверку і наладзіць дакладны ўлік членаў і кандыдатаў партыі, якія сапраўды зьяўляюцца членамі даных ячэйкі (па вучотных картках і членскіх партузносах).

Даручыць аргаддзелу ГК і парткалегіі ГарКК сканцэнтраваць усе рашэньні ні ГК і ГарКК адносна асобных ячэек, арганізаваўшы праверку выкананьня гэтых рашэньняў кіраўніцтвам ячэек, з выяўленьнем выладнаў і канкрэтных вінаватых у невыкананьні і зрыве рашэньняў партыі.

4. Адобрыць ініцыятыву асобных ячэек па скліканьні тэарэтычных канфэрэнцый па пытаньнях тэарэтычнай і палітычнай падрыхтоўкі.

Абавязаць культпроп ГК забясьпечыць выразную падрыхтоўку гэтых канфэрэнцый. Арганізаваць пры партгабінэтах, пенкутках і клюбах кансультацыі па пытаньнях бягучай палітыкі партыі, статуту і праграмы партыі.

Арганізаваць спэцыяльныя кароткатэрміновыя гурткі па ўзьняцьці тэарэтычнага ўзроўню членаў і кандыдатаў партыі, прымацаваўшы да вытворчых і транспартных ячэек у якасьці кансультантаў і кіраўнікоў палітычна падрыхтаваных таварышоў.

5. Лічыць неабходным скліканьне кустовых сходаў кандыдатаў партыі па прапрацоўцы асобных пытаньняў, зьвязаных з іх задачай у сувязі з чысткай партыі і ўзьняцьцем іх тэарэтычнага ўзроўню. Культпропу ГК рэкамендаваць канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзеньні гэтых сходаў.

6. Не пазьней 30 мая ў горадзе і 5 чэрвеня ў вёсцы арганізаваць спэцыяльны палітдзень, прысьвечаны пытаньням чысткі партыі. Агітмасаддзелу ГК забясьпечыць падрыхтоўку і правядзеньне гэтага палітдня.

7. Даручыць культпропу ГК і сакратарам парт'ячэек правесьці на ўсіх прадпрыемствах, установах, саўгасах і калгасах шырокія нарады рабкораў, селькораў, рэдакцый шматтыражак і насьценгазэт па пытаньні ўдзелу друку ў падрыхтоўцы і асьвятленьні работы па чыстцы.

8. Прапанаваць усім парт'ячэйкам да 1 чэрвеня правесьці ўсе арганізацыйныя мерапрыемствы, якія выцякаюць з інструкцыі па чыстцы: складаньне характарыстак на членаў і кандыдатаў партыі, складаньне кожным членам і кандыдатам аўтабіяграфій, наладжаньне ўліку асабістага складу ячэек, праверка запазычанасьці членскіх узносаў.

9. Абавязаць усе парткалектывы і ячэйкі прадпрыемстваў і ўстаноў арганізаваць дапамогу падшэфным вясковым ячэйкам у разгортваньні падрыхтоўчай работы да чысткі. Скінуць у канцы мая інструкцыйную нараду сакратароў вясковых ячэек па пытаньні падрыхтоўкі апошніх да чысткі.

Антысавецкія пляны ангельскіх цьвёрдалобых

„Нафтавая згода" і пакт аб снабжэньні зброяй Пэрсіі

Меўшы месца ў сьнежні месяцы мінулага году англа-пэрсідзкі нафтавы канфлікт скончыўся новай згодай, па якой Пэрсія атрымала большую долю ўдзелу ў эксплёатацыі нафтавых крыніц.

Новая згода прадугледжвае ўплату пэрсыцкаму ўраду 4 шыл. золатам з кожнай адабытай «Англа-Пэршэн Ойль Ко» тоны нафты пры гадавым мінімуме ў 5 млн. тон. Апрача гэтага, пэрсідзкі ўрад атрымлівае 2 млн. ангельскіх фунтаў у пакрыцьцё сваіх мінулых прэтэнзій.

За гэта «Англа-Пэршэн Ойль-Ко» атрымала працяг сваёй канцэсіі яшчэ на 80 год.

Гэта згода паказвае, што брытанскі ўрад заняў зараз зусім іншую пазыцыю, чым у сьнежні, калі ён [illegible] пагражаў свае крэйсэры ў Пэрсідзкую заток.

У чым тут справа?

Брытанскі імпэрыялізм, абвясьціўшы эканамічную вайну СССР у сувязі з Маскоўскім працэсам ангельскіх інжынэраў «Метрапалітэн Вікерс», хоча скарыстаць свае становішча ў Пэрсіі, каб стаповіча ў Пэрсіі, каб [illegible] ангельскіх гандлёвых адносін, якія шырока разьвіліся.

Умовы, на якіх заключана новая брытанска-пэрсідзкая згода, зьяўляцца па сутнасьці «уступкай» пэрсідзкаму ўраду, каб схіліць яго заключыць да гавор з Англіяй, у якім павінен быць прадугледжан цэлы рад пераваг для ангельскіх капіталістаў у Пэрсіі.

Як паведамляе «Дэйлі Геральд», у Лёндан павінен у бліжэйшы час прыбыць прадстаўнік пэрсідзкага ўраду для заключэньня канкрэтнага дагавору, у якім будзе агаворана перавага брытанскіх падданых за ўсіх пэрсідзкіх канцэсіях, удзел Англіі ў арганізацыі пэрсідзкай [illegible], асабліва на пэрсідзка-савецкай [illegible] і прадугледжана закупка Пэрсіяй у Англіі вялікай колькасьці зпаражнённых.

Супастаўляючы ўсё гэта з фактам разрыву ангельска-савецкіх адносін, з правадзіўшымі Японіяй пры дапамозе брытанскага імпэрыялізму агрэсыўнымі дзеяньнямі на КУЧ—будзе ясна, што брытанскі імпэрыялізм падрыхтоўвае на шлях на СССР, да адпору якога павінен быць падрыхтован увесь сусьветны пралетарыят.

(«ЮМАНІТЭ»).

Замежная хроніка

* Адкрылася 72- сэсія Рады Лігі нацый. Парадак дня: даклады аб работе, аб гандлі опіюмам і разгляд петыцыі супроць антысэміцкай палітыкі германскага ўраду. На закрытым пасяджэньні рады абмяркоўвалася пытаньне аб петыцыі, паданай жыхаром Верхняй Сілезіі Берэгэйам, які патрабуе скасаваньня антысэміцкіх законаў германскага ўраду. Германская дэлегацыя цьвердзіла, што Берэгэйм ня можа быць прызнан да нацыянальнай меншасьці. Рада даручыла камітэту юрыстаў высьветліць пытаньне.

* На працэсе фашыстаў у Брно былы калчакоўскі генэрал, а цяпер лідэр чэскіх фашыстаў **Гайда**, адмаўляючы свой удзел у падрыхтоўцы путчу, прагаварыўся, што ў 1930 г. падрыхтоўвалася правакацыйная інспіраваная «нападу камуністаў на вазныя казармы ў Брно» каб абрабляваць позад для забароны кампартыі.

* У Амстэрдаме адбылося пасяджэньне Бюро Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу моладзі. Адозва бюро зьмяшчае ня мала гучных фраз аб фашысцкай тыраніі, але ні адным словам не алгусваецца на заклік Камінтэрну і Кіму аб стварэньні адзінага фронту барацьбы супроць фашызму.

* У Балгарыі, ваенныя суды прыгаварылі да кары сьмерці 5 салдат за арганізацыю камячэек у арміі. Двое прыгавораны заочна, бо ім удалося ўцячы. Апрача таго, 16 салдат прыгавораны ўвоўле да 127 гадоў катаргі. Балгарская рабочая партыя арганізавала кампанію пратэсту, супроць зрыгаваньняў.

Фашысты разганяюць сходы данцыгскіх нацыяналістаў

ВАРШАВА, 23 (Белта). Учора атрад у 100 штурмавікоў увярваўся на перавыбарчы сход, наладжаны нямецкімі нацыяналістамі ў ваколіцах Данцыгу. Начальнік атраду дэпутат прускага ляндтагу **Лясман** разразіўся па адрасе сабраўшыхся лаянкай і крыкнуў аратару: «Мы ўбачымся ў канцэнтрацыйным лягеры». Сход быў распушчан Лясманам.

Разам з наближэньнем выбараў, пры хільнікі сонату робяць спробы затрымаць разгарах нацыянал-сацыялісцкай прапаганды. У выдалай адозве партыя старшыні сэнату **Ціма** зварочваецца да мас з заклікам: «Абараняйце нас перад карычневым тэрорам».

Дзіўнае „перамір'е"

ТОКІО, 23 (Белта). Як паведамляе «Сымбуй-Рэнго», паміж кітайскімі і японскімі ўладамі ў Паўночным Кітаі дасягнута згода аб перамір'і на ўмовах, што кітайскія войскі адводзяцца з Бэйпіну, а японскія войскі не ўваходзяць у горад.

Германскі друк незадаволен прамовай Дэвіса

БЭРЛІН, 23 (Белта). Прамова ДЭВІСА (дэлегата ПАЗШ) у Жэнэве камэнтуецца найбольш уплывовымі германскімі газэтамі вельмі адмоўна. Указваюць, што яна ідзе далёка наустрач французкім пажаданьням. У сьвеце крытычных выказваньняў асаблівай увагі заслугоўвае тое, што РОЗЭНБЭРГ у «ФОЛЬКІШЭР БЭОБАХТЭР» дозагаворачна вітае заяву Дэвіса, указваючы, што Дэвіс падкрэсьліў абавязацельствы іншых дзяржаў разбройвацца і, апрача таго, прызнаў, што прамова Гітлера спрыяла далейшым работам канфэрэнцыі па разбраеньні.

Арышты членаў баварскай народнай партыі

БЭРЛІН, 23 (Белта). Каля Форхгейма (Баварыя) у мінулую ноч быў забіт адзін нацыянал-сацыялісцкі штурмавік. У сувязі з гэтым арыштавана 21 член баварскай народнай партыі і былой (цяпер распушчанай) ваеннай арганізацыі баварскай народнай партыі «Байернвахт».

ВОПЫТ СЛУЦКАГА РАЁНУ

ЯК БАЛЬШАВІКІ СЛУЦКУ І ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЫ НА АСНОВЕ ІХ ВОПЫТУ—ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

СОСКІН
Сакратар слуцкага РК КП(б)Б

40 адваяваных дзён

Слуцкі раён адным з першых у БССР скончыў веснавую сяўбу 1933 г., заваяваўшы ганаровы чырвоны сьцяг імя ЦК і СНК БССР.

Чым тлумачыцца гэта вялікая перамога?

Гістарычныя пастановы студзеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), праграмныя прамовы тав. Сталіна на пленуме і на першым усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў былі шырока прапрацаваны у масах. Калгасьнікі добра ўсьвядомілі указаньні тав. Сталіна аб тым, што трэба зрабіць, каб стаць заможнымі.

Быў праведзен рад арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў: раённых, куставых і сельсавецкія зьлёты ўдарнікаў-калгасьнікаў, зьлёты жанчын-калгасьніц, зьлёты аднаасобнікаў, нарады брыгадзіраў, паляводаў, загадчыкаў фэрм, рад курсаў па асобных галінах калгаснай працы.

Была праведзена рашучая ачыстка калгасаў ад кулацкіх і клясава-варожых элемэнтаў, якія «цілай сапай» падрывалі калгаснае будаўніцтва.

У калгасе імя Ягорава, Урэцкага сельсавету, выкрыта агрэся кулакоў і заможнікаў, якія займалі камандныя вышыні, раскрадвалі насеньне, гвалілі прадукцыю, выводзілі са строю цягавую сілу. Такая-ж контр-рэвалюцыйная група выкрыта ў калгасе «Чырвоная горка», Сарагоўскага сельсавету. У калгасе «Парыская камуна» Сарагоўскага сельсавету кулацкая хаўра разбурала гаспадарку, знішчала 4 га пшаніцы, два га ячменю, 4 га ільну, раскрадвала авёс, гародніну і бульбу.

Партыйная арганізацыя Случчыны мабілізавала масы калгасьнікаў на барацьбу з кулацкімі элемэнтамі, узьняла рэвалюцыйную пільнасьць камуністаў, прыняла рад мер па ўмацаваньні партыйных ячэек, сельсаветаў і калгасаў бальшавіцкімі кадрамі. За апошні пэрыяд на пастаянную работу ў сельсаветы і калгасы паслан 31 чалавек, з іх 18 непасрэдна ў калгасы. Гэтым самым рэзка ўзьнялася якасьць работы партыйных ячэек і сельсаветаў. Вось чаму ў радзе сельсаветаў (Першамайскі, Грэскі, Урэцкі) пасеўная кампанія прайшла з посьпехам без пасылкі ўпаўнаважаных РК і РВК.

Раённы камітэт партыі ўзяў курс на арганізацыю апорных пунктаў работы: апорных ячэек, сельсаветаў і калгасаў. У кожным сельсавеце ёсьць некалькі ўзорных калгасаў. У раёне налічваецца каля 40 калгасаў, якія паказалі прыклады барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сяўбы.

У выніку перанясьня партыйна-масавай работы ў калгасы, брыгады, мы маем вялікія зрухі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў: узьнялася працоўная дысцыпліна, значна палепшыліся адносіны калгасьнікаў да грамадзкай маемасьці, вырасла зацікаўленасьць у рабоце, палепшыўся догляд каня.

Той факт, што ў часе сяўбы каля 1.200 аднаасобных гаспадарак уступілі ў калгасы, дэманструе посьпехі калгаснага будаўніцтва.

Случчына заняла першае месца ў веснавой сяўбе і тому, што мы рыхтаваліся да весны яшчэ з восені. Восеньню мінулага году 80 проц. плошчы было зазяблена. За зіму вывезена больш 70 проц. гною, сабрана поўнасьцю неабходная колькасьць насеньня. Ужо 20 сакавіка пачалася звышраньняя сяўба.

Раённы зьлёт ударнікаў высунуў баявы лёзунг: **заняць першае месца ў БССР па якасьці і тэмпах веснавой сяўбы, даць высокі ўраджай.** Вакол гэтага лёзунгу былі мабілізаваны шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

У радзе калгасаў раёну разгарнулася спаборніцтва на лепшую якасьць палявых работ, на заваяваньне высокіх ураджаяў. Калгасы «Новае жыцьцё», «Першае мая», «Рэвалюцыя» і інш. у некалькі раз перавыканалі плян вывазкі гною, вывезьлі ўвесь гной з гарадзкіх і местачковых рынкаў. Брыгады і калгасьнікі спаборнічалі паміж сабой, хто з іх вывезе больш навозу.

Бракеражныя камісіі правяралі якасьць ворыва і сяўбы, за многіх мясцох для гэтай мэты вылучаліся вопытныя старыя калгасьнікі і аднаасобнікі. Брыгада правярала брыгаду. Тыя, хто нядобраякасна працаваў, хто дапусьціў сяўбу ў аднавор, агрэхі, нізкія нормы высеву, прыцягваліся да суровай адказнасьці. У калгасе імя Варашылава, Паліварпаўскага сельсавету, на плошчы ў 5 га было засеяна па 6-7 пудоў аўса. Саме калгасьнікі выкрылі факт дрэннай сяўбы і патрабавалі прыцягненьня шкоднікаў да адказнасьці.

На многіх вучастках нізкія месцы былі заліты вадой. Каб не дапусьціць вымачкі, калгасьнікі па ўласнай ініцыятыве капалі канавы, рабілі стокі для вады. Гэта адыграла выключна вялікую ролю ў своячасовым завяршэньні веснавой сяўбы. Многія калгасы раёну перавыканалі пляны сяўбы за лік выяўленьня новых вучасткаў, засеву ўсіх вольных земляў.

Калгас «Гігант» паводле пляну павінен быў пасеяць 130 га аўса, а засеяў 218 га, ён перавыканаў плян і па ўсіх іншых культурах.

Вялікую ролю ў сацспаборніцтве калгасаў, брыгад і аднаасобнікаў адыграў раённы і нізавы друк.

У большасьці калгасаў і брыгад выходзілі насьценныя газэты, у радзе месц на палёх выпускаліся газэты перасоўкі.

Шырока практыкаваўся мэтад абмену газэтамі паміж брыгадамі.

Вялікі ўплыў рабілі чырвоныя і чорныя дошкі, якія вывешваліся за ўсіх сельсаветах, калгасах і брыгадах. Ёсьць рад прыкладаў, калі калгасы, занесены на чорную дошку, намаганьнем усіх сіл ліквідавалі адставаньне і раней за іншых скончылі сяўбу.

Амаль за ўсіх населеных пунктах працавалі аграўпаўнаважаныя па дзесяцідворках з членаў сельсаветаў. Гэтыя аграўпаўнаважаныя правялі вялікую работу ў аднаасобным сэктары. Значна дапамагла пасылка брыгад з лепшых праверэных актывістаў у адсталыя вёскі.

Вялікую ролю ў забесьпячэньні бальшавіцкіх тэмпаў і высокай якасьці сяўбы адыграла **палітычна-масавая работа, разгорнутая палітаддзелам МТС у калгасах раёну.** Дзякуючы гэтай рабоце значна ўзьнялася сьвядомасьць калгасных мас, узмацнілася клясавая пільнасьць калгасьнікаў.

Аб нашай перамозе ярка сьведчаць наступныя лічбы: на 5 мая 1932 году было засеяна 5,4 проц. пляну, а ў гэтым годзе засеяна 58,8 проц.; на 10 мая мінулага году было 11,7 проц., у гэтым годзе — 74,9 проц.; на 20 мая ў мінулым годзе было засеяна 41 проц. пляну, у гэтым — 100,8 проц.

Пасеўная кампанія першага году другой пяцігодкі скончана на 40 дзён раней мінулага году.

Гэту бліскучую перамогу на пасеўным фронце Случчына заваявала, дзякуючы канкрэтнаму, баявому, апэрацыйнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Гікало.**

Па-бальшавіцку замацаваць дасягнутыя посьпехі, мабілізаваць масы на выкананьне далейшых задач, пастаўленых партыяй перад намі, на пасьпяховае правядзеньне праполкі і ўборкі, на заваяваньне высокіх ураджаяў, яшчэ больш узьняць клясавую пільнасьць — вось галавыя задачы, якія стаяць перад партарганізацыяй Случчыны. З гэтымі задачамі мы павінны справіцца ва што-б там ні стала.

НАША КАЛГАСНАЯ ПАДЗЯКА

З ліста калгасьнікаў-ударнікаў калгасаў раёну дзейнасьці Слуцкай МТС т. ГІКАЛО

Падводзячы вышкі сяўбы, мы яшчэ раз горача вітаем пастанову студзеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб арганізацыі палітаддзелаў. Мы ўжо ў гэту вазну адчулі вялікую практычную дапамогу палітаддзелу МТС у барацьбе за тэмпы і якасьць сяўбы.

Адразу-ж па прызначэньні нашы палітаддзелаўцы патрэбіліся ў калгасных буднях, увайшлі ў дробязі калгаснага жыцьця. Вось некалькі прыкладаў:

Пры дапамозе палітаддзелу мы выкрылі і выгналі з калгасу «Камінтэрн» цэлую кулацкую аграю, якая раскрадвала калгаснае дабро, на чале з старшынёю Якімовічам — былым белым афіцэрам.

У калгасе «Новая мльнка» гультаі зрывалі работу. Палітаддзел дапамог нам выкінуць з калгасу злоснага гультая Хавустовіча і заклікаць да парадку іншых і справы ў калгасе палепшыліся.

Палітаддзел дапамог арганізаваць сацыялістычны буксір перадавых адстаючым. Калгасы «Праўда» і «Пераменьнік» па ініцыятыве палітаддзелу, партыйнай і камсамольскай ячэйкі ўзялі на буксір калгас «Новая мльнка» і дапамаглі яму сваімі коньмі. Калгасы «Пераможца», імя Сталіна, «Новы сьвет» дапамаглі калгасу імя Ботвіна 186 конямі і 220 чалавекамі.

Палітаддзел арганізаваў праверку якасьці нашай работы, тут-жа дапамагаў выпраўляць недахопы і памылкі.

Арганізаваў палітаддзел і агітфургон з радыё, кіно і бібліятэкай. Ён абслугоўвае нашу брыгаду ў полі ў часе адпачынку.

Ва многіх брыгадах пры дапамозе палітаддзелу выдзелены агітатары і чытары, якія ў часе перапынку праводзяць з намі чыткі і палітгутарки. Працуючы на полі, мы ведаем пра ўсе пастановы партыі і ўраду, пра аграправілы, сяўбу ў іншых калгасах, а таксама, што робіцца за мяжой.

Значна лепш у гэтым годзе працуюць камуністы і камсамольцы ў брыгадах і калгасах.

Палітаддзел прасунуў у калгасы сельска-гаспадарчую і іншую літаратуру. У некаторых калгасах арганізаваны кіёскі.

Зараз мы цьвёрда ўпэўнены, што МТС пры дапамозе палітаддзелу стане моцным арганізатарам нашай калгаснай гаспадаркі.

Мы просім вас, тав. Гікало, перадай це ад нас найлепшаму нашаму калгасьніку і ўдарніку тав. **СТАЛІНУ** нашу калгасную падзяку за ініцыятыву ў стварэньні палітаддзелаў, за яго жыцьцёвыя канкрэтныя ўказаньні, як зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі.

ПОДПІСЫ.

МІКОЛА ХВЕДАРОВІЧ

УДАРНІКАМ СЛУЦКІХ ПАЛЁЎ

Вы тэмпы трымалі;
Ахоплена штурмам,
Гарэла зарчэй
Бальшавіцкая хроў.
І злосна
Шчэ́рблены вораг
Ў зазары,
Сьцісканючы зубы
За вамі сачыў,
За кожным загонам,
За кожным гэктарам,
Каб нашу пасеўную
Перамагчы.
Сталёвым-ж конямі
Ня знаючы змоні,
Узьнімалі багатыя
Сяўбы ральні.
То штурм бальшавіцкі,
То сьнег перамогі,
Гучэў на калгаснай
Ўраджайнай зямлі.
Зялёнаю рунню
Радасныя ўсходы,
Да сонца выпростваюць
Вашы палі.
І там,
Дзе буялі
Палын і макрыца,
Быльнёг на узьмежках
Вятрамі звеніў.
Аўсом маладжавым,
Расою іскрыцца
Шырокае поле
Калгасных ніў.

Вітаньне ўдарніку
«Карла Маркса»,
Што, тэмпы трымаючы,
Якасьць узьняў,
Ён першым
Ў калёнах
Слуцкіх калгасаў,
Змагаючы гэктары —
Ночы ня спаў.
На роўнядзі слуцкай
Бязьмежжа блакіту,
І зьнікла за полем
Калгасным мяжа.
Змагаўся Вязьверхаўскі
Гурба Мікіта,
За добры
багаты
калгасны ўраджай.
Ён ночы ня спаў, —
Старшыня калгасу,
З актывам нарада,
Аж покуль відно.
Ён сам кіраваў
І на полі змагаўся,
І ў кожны палетах
Навожаны гной.
Ён глебу
К пасеву
На пух ператроіў,
На стайнях
Дагледжаны коні
Ў пару.
У «Новым жыцьці»
Ужо зьнікае
Старое,
І жывая радасьць
Крыльніць змагароў.
Вынікае бясхлебіцы
Чорнае гора,
Бядняцкіх гаротных
Вяздоўных натраб.
Красуе пшанічнае
Сіняе мора,
І ў кожнага ў хаце
Падсеяны хлеб.
Старое-ж, як пудзіла
Чорнае ночы,
Ня хочуць бязьверхаўцы
Назад згадаць.
А вось дарасьніцы,
Ударнікам слава!
Навалу змагалі,
Вялі барацьбу.
Дае мокра,
На полі,
Капалі канавы,
І скончылі ў тэрмін
Вясновую сяўбу.
Вам сьцяг перамогі,
Вам гонар
І слава,
Зялёнаю рунню
Красуюць палі.
Набухне калосьсямі
Вашая справа,
Багацьцем ўраджайнае
Калгаснай зямлі.

Слуцак,
22-V—33 г.

ЯЗЭП МІНЧЭНЯ
Старшы брыгадзір к-су імя Сталіна

САМІ СТАРАЛІСЯ

Яшчэ ў сакавіку арганізавалася наша першая брыгада. Атрымалі мы вучастак. Разьбіліся па зьвеньнях—аратых, сейбітаў машынай, сейбітаў уручную, возчыкаў гною. 40 чалавек працавалі ў брыгадзе. Атрымалі мы 19 коняй, збрую і інвэнтар. Кожны калгасьнік адказваў за даручаных яму коняй і інвэнтар.

Вывезьлі мы ўвесь гной — бралі яго на рынку, з калгасных хлявоў, з-пад сваёй жывёлы. Хлопцы біліся за гной—хто больш вывезе. Ні аднаго кавалка зямлі не пакінулі няўгноены. Ачысьцілі насеньне, пратруцілі яго сухім парашком.

30 сакавіка выехалі ў поле. Пачалі звышраньнюю сяўбу. Ня прыхо-

дзілася мне падганяць калгасьнікаў —самі стараліся працаваць лепш. А дысцыпліна палегчыла работу. Нормы ў нашай брыгадзе выконваліся амаль кожным. Нічога ня сеялі ў аднавор, вытрымалі ўсе правілы.

Да тэрміну мы скончылі сяўбу аўса. Да 25 красавіка засеялі ўсе раньнія збожжавыя культуры. Цяпер нам трэба лепш прапалоць і ўбраць ураджай.

Атрымаем высокі ўраджай—палепшым сваё жыцьцё. Зуоім моў рацыю тав. Сталін, калі сказаў, каб стаць заможнымі, трэба толькі сумленна працаваць.

Калгас імя Сталіна, Урэцкага сельсавету, Случчына.

КАРШУК
Сакратар Урэцкай парт'ячэйкі

Дружная вясна

Сёлета калгасьнікі і аднаасобнікі Урэцкага сельсавету скончылі сяўбу да 20 мая. Засеяна 1.460 га. Працавалі дружна, як ніколі.

Якімі шляхамі дабіліся мы гэтага?

Урэцкая парт'ячэйка да тэрміну скончыла загатоўкі ўсіх відаў. Са студзеня месяца мы пачалі падрыхтоўку да пасеўнай і аддалі ёй усю сваю ўвагу.

Першае, што кінулася ў вочы — гэта засьмечанасьць калгасаў кулацкімі заможнымі элемэнтамі, былымі балахоўцамі.

У калгасе імя Ягорава, дзе ў праўленьне пралезьлі кулакі, ня былі створаны насеньны і страхавы фонды. Гінулі коні. Добрая зямля, але засьмечаная і запушчаная, давала самы нізкі ўраджай. Калгасьнікі атрымалі на працадзень толькі па 1 кілёграму, у той час, як у суседнім калгасе імя Сталіна, дзе глеба горшая, выдалі па 4 клг. збожжа на працадзень.

Перш за ўсё парт'ячэйка ачысьціла калгасы ад антысавецкіх элемэнтаў. Двух лепшых камуністаў тав. **ЧАРНАГУБАЎСКАГА і МАГІЛЕЎЦА** мы вылучылі старшынямі калгасаў. З самага пачатку падрыхтоўкі парт'ячэйка прымацавала да ўсіх калгасаў пастаянных упаўнаважаных з партактыву. Работа ўпаўнаважаных і старшынь калгасаў кожны тыдзень правярялася на бюро, сходах ячэек і на спэцыяльных нарадах.

Мы давялі да кожнага калгасьніка пастановы партыі і ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці, аб працадысцыпліне, Пераглядзелі склад брыгадзіраў і кожнаў. Вылучылі з лепшых, больш вопытных калгасьнікаў-ударнікаў, сейбітаў і плугароў. За брыгадамі замацавалі пастаянныя вучасткі, коняй, збрую і інвэнтар.

Ва ўсіх калгасах склалі вытворчыя пляны. У сямі калгасах (з 10) увялі севазварот, сабралі і ссыпалі насенныя і кармавыя фонды.

У кожным калгасе якасьць работы правярялася штодня брыгадзірам, старшынёй, упаўнаважаным парт'ячэйкі і інспэкцыяй па якасьці з ліку больш вопытных калгасьнікаў-ударнікаў. У калгасе «Першае жніўня» за дрэнную якасьць працы быў выключан калгасьнік Гурбо.

Трэба адзначыць, што сяўбе значна дапамагло ўрэцкае сельспажыўтаварыства. Яно заахвочвала ўдарную работу, выдаючы лепшыя тавары калгасьнікам-ударнікам.

Сельспажыўтаварыства змагло паставіць сваю работу так, што кожны дзень яно ведала, як працуе кожны калгас і асобная брыгада. Тыя калгасы і калгасныя брыгады, якія добра працавалі, атрымлівалі лепшай якасьці і ў большай колькасьці тавар, а зрыўшчыкам сяўбы абвяшчаўся тавары байкот.

Калгасьнікам вельмі спадабалася мерапрыемства сельспажыўтаварыства па арганізацыі развозу тавараў у поле. Работнікі сельспажыўтаварыства, выяжджаючы з таварамі ў поле гэтым самым ня толькі прымалі ўдзел у сяўбе, але і ў праверцы якасьці работы.

Посьпехі нашых калгасаў сталі відавочнымі. Пераканаўшыся ў моцы калгаснага ладу, больш як 50 гаспадарак аднаасобнікаў у часе сяўбы ўступілі ў калгасы.

КНЯЗЕЎ
Старшыня Слуцкага РВК

СЕЛЬСАВЕТЫ НА ПАСЕЎНАЙ

Веснавая сяўба бягучага году выявілася адказным палітычным экзамэнам для сельсаветаў Случчыны. Ад сельсаветаў патрабавалася — згуртаваць вакол сябе актыў вёскі, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж членамі сельсаветаў, сэкцыямі і дэпутацкімі групамі на лепшае правядзеньне сяўбы.

Сельсаветы Случчыны першымі ў БССР уключыліся ва ўсебеларускае спаборніцтва на лепшае правядзеньне сяўбы і выклікалі сельсаветы Бабруйскага раёну. У аснову сацспаборніцтва былі пакладзены: барацьба за поўную ссыпку насенных і страхавых фондаў, стараннае пастаянных вытворчых брыгад, лепшая падрыхтоўка цягавай сілы, правядзеньне сяўбы ў максымальна кароткі тэрмін, дасягненьне рэкорднага ўраджаю ў БССР.

Многія сельсаветы паказалі ўзоры ажыцьцяўленьня сваіх абавязацельстваў па спаборніцтве.

Сарагаўскі сельсавет своячасова давеў пляны сяўбы да кожнай аднаасобнай гаспадаркі, вылучыў адказных за дзесяцідворкі, дапамог ім наладзіць работу, правёў масавую праверку ссыпкі насеньня і рамонту інвэнтару.

Да 1 мая сельсавет першым у раёне скончыў сяўбу збожжавых культур. Той факт, што аднаасобны сэктар, які складае 48 проц. усіх гаспадарак, разам з калгасамі скончыў сяўбу, паказвае, якую базавую работу правёў сельсавет. Лепшым ударнікам аказаўся член сельсавету **ІЛЬЛЯ МАХНОВІЧ**, які вельмі добра правёў праверку насеньня і с.-г. інвэнтару па сваім вучастку, цьвёрда змагаўся за своячасовы і штодзённы выхад аднаасобнікаў у поле, сыстэматычна правяраў якасьць палявых работ. Яго вучастак скончыў сяўбу збожжавых яшчэ 29 красавіка.

Аднаасобны сэктар, які ў раёне займае 48 проц., доўгі час адставаў. Пасьля сыпнатаў друку аб тым, што падрыхтоўка ў аднаасобным сэктары ідзе самацёкам, прэзыдыум РВК і сельсаветы абвясьцілі штурм прарываў на аднаасобным сэктары. Члены РВК былі прымацаваны да сельсаветаў, праводзіліся плянавыя выезды членаў прэзыдыуму на месцы, была наладжана жывая і тэлефонная сувязь з населенымі пунктамі.

Вопыт **Лучнікоўскага** сельсавету наглядна дэманструе той вялікі пералом, які адбыўся ў ходзе сяўбы на аднаасобным сэктары.

Лучнікоўскі сельсавет, які займае ў раёне па прощаце калектывізацыі адно з апошніх месц (70 проц. аднаасобных гаспадарак) цягнуўся ў хвасьце па тэмпах сяўбы. Прэзыдыум РВК абсьледаваў работу сельсавету; выявілася, што ў сельсавет пралезьлі клясава-варожыя элементы, якія зрывалі пасеўную. Сакратар сельсавету Дробыш і член прэзыдыуму Паўлоўскі праводзілі яўна шкодніцкую работу. Пасьля таго, як сельсавет быў ачышчан ад кулацкіх элемэнтаў, праведзена шырокая масавая работа сярод аднаасобнікаў, прарывы былі ліквідаваны. Аднаасобнік пачаў па-ўдарнаму працаваць на полі.

Вялікім стымулам ударных тэмпаў сяўбы зьявілася своячасовае ўручэньне абавязацельстваў па абавязковай стаўцы збожжа і бульбы дзяржаве. Аднаасобнікі Бокшыцкага сельсавету пасьля ўручэньня абавязацельстваў перавыканалі плян сяўбы.

Дзякуючы арганізацыі па раёне 75 ясьляй і 31 пляцоўкі з ахопам 2.000 дзяцей, удалося вызваліць сотні жаночых рук і кінуць іх на поле. Ва многіх сельсаветах жанчыны перавыканалі нормы ворыва і сяўбы.

Зараз сельсаветы Случчыны павінны пераключыцца на прапольчаную кампанію і падрыхтоўку да ўборкі.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі дабіўся рэкорднага ўраджаю ў БССР.

Канавы

Некалькі дзён засаб у калгасе **«ЧЫРВОНАЯ БЯРОЗА»**, Меляшкаўскага сельсавету, ішлі гарачыя спрэчкі аб раньняй сяўбе. Нават сам старшыня калгасу заяўляў:

— У нас мокра, балоты, рана яшчэ сеяць.

Яму ўторылі кулакі і іх падпявалы:

— Нічога ня будзе, згніе насеньне, трэба сеяць тады, калі разбухне бяроза.

Кулацкі мандэр быў адразу-ж выкрыт парт'ячэйкай.

Праўда, частка калгаснай ральлі была залята вадой, трэба было шукаць выхаду. І бальшавікі яго знайшлі. Аднадушна рапылі капаць канавы, адцягнуць ваду. Пракапалі зеляліччую плошчу. І мітарэльна праз дзень зямля прасохла, можна было пачынаць ворыва. На справе пераканаліся калгасьнікі, што такім чынам можна пазбавіцца ад балота. Дружна ўзяліся за работу.

Тры дні засаб кожны вечар ад работы выходзілі старыя, маладыя, нават жанчыны. Кожную гадзіну пад дружным напорам ударнікаў множыліся мэтры выкапаных канаў. Вада знайшла сабе выхад. Палі асушыліся. Калгасьнікі нагналі ўпушчанае, засеялі ў тэрмін. Зараз нават аднаасобнікі гавораць:

— Хоць папрацавалі калгасьнікі, але глядзеце, як узышлі авёс, ячмень і пшаніца. Густата якая!

Гэты калгас не адзіны. Мы маем шмат прыкладаў гераічнай барацьбы калгасьнікаў за аднаваньне гэктараў з-пад «РАСЬСЬВЕТ», які парашыў ні ў якім разе не адстаць. Калгасьнікі выкапалі канавы на аллегласьць 800 пагонных мэтраў. Зараз асушаныя зямельныя вучасткі пакрыліся добрымі зялёнымі ўсходамі.

У калгасе **«РЭВАЛЮЦЫЯ»**, Дарасінскага сельсавету, пракапалі канавы на аллегласьці 2-х кілёмэтраў. У Прошчыцкім сельсавеце калгасьнікамі выкапана канаў у 4-5 тыс. пагонных мэтраў. Аднаасобнікі па прыкладу калгасьнікаў выкапалі канавы на 1.200 мэтраў.

Рад калгасаў, каб узараць і засеяць сухія месцы сярод балот, рамантавалі дарогі і пракладвалі масты (калгас «Новы сьвет», Серадзінкоўскага сельсавету, «Чырвоная ніва» і «Ударнік», Прошчыцкага сельсавету). У радзе месц арганізаваліся брыгады з вучняў і моладзі для ўборкі каменьняў з поля з тым, каб ачысьціць поле.

Капаньне канаў у Случцкім раёне праводзілася на ўсіх нізкіх мясцовасьцях. Гэта работа поўнасьцю сябе апраўдала. Яна зьяўляецца неадлучнай частай [illegible] рацыбы за ўраджай. У многіх сельсаветах вялікія вучасткі заблочаных месц, якія былі заліты вадой, асушаны. Калгасьнікі адказалі на кулацкую хлусьню добраякасным і своячасовым правядзеньнем веснавой сяўбы.

Капаньне канаў — гэта толькі адна характэрная рыса барацьбы за высокія

ДЗЯДЫ ПЕРАЖЫВАЮЦЬ БАДЗЁРУЮ ВЯСНУ

ПЕРАД НАМІ ПАКАЛЕНЬНЕ, ЯКОЕ ПЕРАЖЫЛО ЖАБРАЦКАЕ, БЕСПРАСЬВЕТЛАЕ, ПОЎНАЕ ГАЛЕЧЫ І ЗЬДЗЕКАЎ ЖЫЦЬЦЁ. ПЕРАД НАМІ ДЗЯДЫ, ЯКІМ ДОБРА ЎРЭЗАЛАСЯ Ў ПАМЯЦЬ ЖЫЦЬЦЁ РАНЕЙШАГА ЦАРАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ЯНЫ ПАМЯТАЮЦЬ УСЕ ЗЬДЗЕКІ КУЛАКОЎ І ПАМЕШЧЫКАЎ. ЯНЫ ПАМЯТАЮЦЬ, З ЯКОЙ ЗАЯДЛАСЬЦЮ СЬЦЁБАЛІ БІЗУНАМІ ВУРАДНІКІ І ПРЫСТАВЫ.

ЦЯПЕР НЯМА РАНЕЙШАЙ СТАРОЙ УБОГАЙ І ЖАБРАЦКАЙ БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКІ, НЯМА РАНЕЙШАГА ЖЫЦЬЦЯ. ПЕРАД НАМІ СІВЫЯ, СТАРЫЯ, АЛЕ БАДЗЁРЫЯ ДЗЯДЫ І БАБУЛІ КАЛГАСУ «КАМБАЯН». ЯНЫ ПЕРАЖЫВАЮЦЬ МАЛАДУЮ, БАДЗЁРУЮ, ПОЎНУЮ ТВОРЧАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ЭНЭРГІІ КАЛГАСНУЮ ВЯСНУ. ЯНЫ АТРЫМЛІВАЮЦЬ СЛОВА.

***

Дзед Лясун Цімох. — Аб маім ранейшым жыцьці можна адно сказаць. Жыў вельмі непэка. Вечна пястачы, мала было выпадкаў у ранейшым жыцьці, каб ад нявыгадную да новага ўраджаю ў нас у сям'і быў хлеб. Мала таго, зьдзекаваўся з нас дваранін Ліўковіч.

Цяпер у калгасе мяне шануюць, усе раюцца са мною. Я накормлен, апрануты, абут.

Мы ў мінулыя гады горш у калгасе працавалі. Ня ўсе кулакі, людыры і прагулышчыкі былі выгнаны з калгасу. І то ў мінулым годзе я атрымаў на працадзень 7 фунтаў збожжа, атрымаў сена, салому, бульбу ды зашчэ грошы.

У гэтым годзе мы пераджам пазбавіліся ад чужакоў у калгасе і ад пустаслоўя ў полі. Пачысьцілі наш калгас. І паглядзеце, як мы працуем друк на. Зараз на працу нікога будзіць ня трэба. Па-гаспадарску падрыхтаваліся да весны. Зірнеце — зямля як пух. Добра працавалі радковыя сеяркі. Калісьці, каб уозчыць нашы дзяды гэтыя сеяркі, яны-б падумалі, што гэта начыстая сіла, пан-бы ў дзяркве пабажэнства адолукыў. А зараз усе нашы дзяды шануюць машыны. Яно, з машынай, пры засеве спарней у рабочай сіле, у насеньні, і ўраджай лепшы будзе. Праўду,кажучы, баяўся я звышраньняй сяўбы. Калі некалькі дзён не зьяўчыліся ўсходы, думалі мы—загінула наша насеньне. Дзён праз пяць, яшчэ досьвіткам я ўстаў. Глядзку гэта я, засеянае поле. Весела, стройна, на сонейка ўверх сьцяблы падняліся. Ну, думаю, хваробу буцуць сьмяяцца з нас кулакі. Выцла па-нашаму. Хораша, дручна цяпер працуем. Жанчыны і моладзь у гэту вясну паказалі, як трэба працаваць.

***

Бабка Палагея Казёл.—Дзеткі мае! мне ўжо гутка будзе 65 год. Як я шкадую, што такой старой я ў калгаснае жыцьцё ўвайшла. Я-ж толькі што пачала жыць па-людзку, як гаспадыні. Як быццам толькі што на сьвет нарадзілася. Намучылася, пацярпелася, дзеткі мае даражэнькія, я за маё мінулае жыцьцё. Вельмі цяжка мне ўспомніць мінулае. Яно прайшло, як ночачка зімняя. Вось ужо чатыры гады, як я ў калгасе. Раней было цяжка, кулакі перашкаджалі. А зараз усё лепш жыцьцё становіцца ў калгасе. Во, глядзеце, як я абута, апранута, паесьці ёсьць чаго, магу і вас пачаставаць. Дзеці ўсе ў людзі пашлі. Адзін сын у Чырвонай арміі ажно да камандзіра дайшоў. Другі —вось старшыня калгасу «Першага мая». Як мне радзона слушаць, калі гавораць, што мой сын добры старшыня калгасу, добры гаспадар.

Люблю гэта я глядзець, як нашы калгасы квітнеюць, усё пашыраюцца. Каб я памерла пяць гадоў таму назад, я-б нікоці ня бачыла такіх пакояў, як зараз пабудавалі для коняй, кароў, цялят і сьвіней. Наша жывёліна цяпер жыве лепш, чым мы жылі раней, пры царскім рэжыме.

Успомню я, як я гэта хадзіла па вёсцы і ўсё ўгаворвала мужыкоў пайсьці ў калгас. Не хацелі. А зараз—

НАРАДА СТАРОГА ПАКАЛЕНЬНЯ КАЛГАСУ «КАМБАЯН».

браткі мае, як убачылі, што ў нас добра ідзе работа, дык нельга ад іх адбіць ка.

У гэтым годзе мы добра працавалі. Рана скончылі сяўбу. І бачыце, якія вынікі. Роўненька ўсё ўзышло. Толькі вось баялася, каб не шкодзела нічога. Кожны дзень, гэта, я раненька ўстану і ўсё жадаю рукамі пшаніцу, авёс, ячмень.

Мне, вось, маладыя гаварылі пра тав. Сталіна, што ён самы лепшы ўдарнік па калгасах. Гэта ён гаварыў, што трэба ўсіх калгасьнікаў зрабіць заможнымі. Дык вось у гэтым годзе, мне здаецца, што мы ўжо будзем лепш жыць за серадняку.

***

Дзед Лясун Іван.—Я хачу сказаць, што мне, старому, вельмі падабаецца планавасьць, работа па брыгадах і зьвеньнях, якая зараз у нас праводзіцца. Таксама мне падабаецца, што ўстанавілі дысцыпліну. Як гэта добра, што кожны ведае, калі і што ён робіць, і колькі ён, калі сумленна будзе працаваць, атрымае. У мінулым годзе мы зацягнулі сяўбу да 15 чэрвеня. А зараз мы начыстую скончылі раней на цэлы месяц. Яшчэ 19 мы пачалі палоць ужо. Мне таксама вельмі падабаецца, што наша партыя стараецца, каб сярод нас ня было кулакоў, злодзеяў і жулікаў. У гэтым годзе, калі мы пралезьлі чыстку ад кулакоў, добра нашы калгасьнікі працавалі.

Зараз толькі жыць пачаў час. Калісьці чалавекам мяне ня лічылі. Батракам быў увесь час. Вучыць дзяцей хацелася, а грошай ніколі ня было.

Маладым я хачу падзякаваць за тое, што мне далі такую работу, якую я найбольш люблю. Люблю вось пчаляркта і садоўніцтва. Проста, як на маленькай дзецкай гульні. Я ўжо пастараюся каб мёд і [illegible]

***

Дзед Сергавец Цімох.—Дзякуй бальшавікам і савецкай уладзе, што забралі ад мяне вечную маю галечу. Вечна я пакутаваў—то хлеба, то сена нема, то няма чаго на ногі абуць. І працавалі як праклятыя—і на пана і на сябра. А што мы бачылі ў старыя часы апрача лапцей і даматкаваных штанаў.

А зірнеце зараз на народ малады. Куды там лапці, ня ўсе ўжо хочуць боты абуць—усё пчыўлеты ды пчыўлеты. Майткі, піджакі пачалі насіць.

Радасна неяк на душы і крыўдна—чаму такое жыцьцё ня прыйшло раней. На чорта мы пражылі такі век! Вось надоечы прайшоўся я на полі, паглядзеў на пшаніцу, авёс, на аўсы. Якая гушчыня. Радасьць бярэ. Малайцы хлопцы, працавалі добра. Нават з 20 га зямлі каменьні пазьбіралі. Тут табе і поле ачысьцілі, тут табе і буйны матар'ял.

Хлеба і іншых прадуктаў у гэтым годзе нашы калгасьнікі атрымаюць, што ніколі столькі ня думалі атрымаць. Трэба сказаць, што разумная і добрая рэч гэтыя калгасы, яны вывядуць сялян з цемры і вечнага жабрацтва.

***

Дзед Казёл Іван.—Вось я ня здужаў цяжкую работу. Тады мне далі лягчэйшую, таксама карысную работу. Адказваю гэта я за цялят і жарабят. Стараюся я, каб яны былі добрыя, сытыя. І вось паглядзеце, як яны падбрыкваюць.

Раней я пану па трэцюю часьць працаваў. Цяжка было мне рабіць, але беспасьць прымушала. Яшчэ я хачу сказаць, што мне падабаецца працаваць арцельна. Калісьці гаспадар, бачачы, як яго сусед засяе на няўгноеным, лепска апрацаваным полі, быў рад, ніколі не параўць, як лепш зрабіць. А зараз настаў такі час, што адзін за за-і дзяржаве, і калгасьнікам для сябе і на калгасны рынак.

***

Дзед Сергавец Цімох.—Дзякуй бальшавікам і савецкай уладзе, што забралі ад мяне вечную маю галечу. Вечна я пакутаваў—то хлеба, то сена нема, то няма чаго на ногі абуць. І

ДАМАГАЛІСЯ ПЕРАМОГІ НА ФРОНЦЕ СЯЎБЫ

ВОПЫТ ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЁНУ

З ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ ЗА НЕАДКЛАДНАЕ І ВЫСОКАЯКАСНАЕ ЗАВЯРШЭНЬНЕ СЯЎБЫ!

Калгас «Прамень». Калгасьнікі чытаюць брыгадную штодзенку

Шэфтар
Начпалітаддзелу МТС

НАШ ВОПЫТ

Перад палітаддзеламі ў гэту вясну партыя паставіла асноўную балявую задачу—у тэрмін і добра засеяць.

Трактарны парк Танескіцкай МТС ва сваёй задачай спраўіўся здавальняюча.

Нашы трактары працавалі 22 гадзіны ў суткі, у дзве зьмены. Там, дзе ня было ліхтароў, працавалі з факеламі. На працягу 20 начэй на палёх буйных калгасаў нашага раёну зіхацелі факелы. У гэтай працы—**атрад Карунага, трактарысткі Гарбуз Ганна, Гапановіч, Ваўністая** паказалі сапраўдныя ўзоры. **Трактарны парк перавыканаў свой план на110 проц., апрацаваўшы замест 4.046 га—4.514 га.**

Дасягненьнем нашым зьяўляецца і тое, што ў нас ня было буйных аварый, як у мінулым годзе. Гэтаму спрыяла масавая работа, праведзеная ў нашу рамку барацьбы за працоўную дысцыпліну, са шкодніками (паказальны выпадак суд над старшым рулявым—кулаком Булатам) гэтаму спрыяла жорсткая самаачыстка радоў трактарыстаў.

Адным з асноўных аб'ектаў увагі палітаддзелу быў конь. Мы ў першыя-ж дні веснавой сяўбы сустрэліся з няправільным скарыстаньнем коньскай цягі ў радзе калгасаў, а ўраўніваўкай у нормах нагрузкі. Апошнія былі ў некаторых месцах зьніжаны і адпольковымі для слабых і моцных коняй. З усёй вастрынёй мы паставілі пытаньне барацьбы з гэтай ураўніваўкай на партсходах 4 сельсаветаў, на сходах калгасьнікаў. У сямі калгасах палітаддзел арганізаваў агляд усіх коняй да і пасьля работы. Запісваліся прозьвішчы брыгадзіраў і прымацаваных, тут-жа на стайні праводзіліся гутаркі. Вінаватыя ў дрэнным доглядзе коня прыцягваліся да адказнасьці. І тут, у барацьбе за лепшага каня, мы маем узоры адданай працы. **У калгасе «Нараджэньне сацыялізму» самі калгасьнікі па сваёй ініцыятыве зьбіралі па брыгадах ячмень для коняй, сабраўшы з брыгады па 30, 25 вазоў.**

Барацьба за якасьць сяўбы—галоўная задача, на выкананьне якой была накіравана ўся ўвага палітаддзелу. Барацьба за радковую сяўбу, за якасьць пасадкі бульбы займала вялікае месца ў нашай рабоце. Калі да сяўбы мы разам з РК правяралі выкананьне плянаў па ўгнаеньні, наяўнасьць сяўпраж, трапчотак, плугоў, насеньня, дык ў момант самой сяўбы мы йшлі разам з агранамам у кожную брыгаду, дзе садзяць бульбу, дзе сеяць, дзе арэць. І там праводзілі адпаведную масавую работу за якасьць сяўбы. У выніку—бульба пасаджана па ўсіх правілах агранаміі, ячмень засеян радковай сяўбой на 75 проц. Калі якасьць пасадкі бульбы знаходзілася ў руках калгасьніц, мы цярпліва растлумачвалі, перамагаючы і разьбіваючы кансэрватым і спробы іх за лік якасьці павя лічыць колькасьць працадзён. Калі-ж мела месца простае ігнараваньне радковай сяўбы—палітаддзел прыцягнуў праз бюро РК да партыйнай адказнасьці старшынь калгасаў імя Сталіна і «КІМ», дабіўшыся зьняцьця гэтых калгасаў з чырвонай дошкі.

У выніку мы маем наступныя паказальнікі барацьбы за якасьць сяўбы: зямля пад бульбу ўгноєна на 73-78 проц., пад ячмень —82-85 проц., пад гароды, сілас, тутун, кораніплоды—100 проц. Пад авёс было пакладзена 110 тон мінэральных угнаеньняў. Уведзены шматпольныя севазвароты. Далкам пратручана і ачышчана насень по. Ільнанасеньне прапушчана праз палатню.

Брыгадная газэта, індывідуальнае сацспаборніцтва, грамадзкі буксір адсталочых — вось формы барацьбы, якія былі ўжыты ў часе веснавой сяўбы.

ГАРБАВЕЦ
Старшыня Макранскага сельсавету

Дэпутацкая група ў барацьбе за сяўбу

Наш сельсавет выйшаў на першае месца па веснавой сяўбе. Да 15 мая мы поўнасьцю выканалі і нават перавыканалі пасоўныя пляны.

У чым «сакрэт» нашай перамогі? У тым, што, уключыўшыся ва ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурс на лепшы савет, мы змаглі вакол практычнага ажыцьцяўленьня ўмоў конкурсу мабілізаваць усё: дэпутацкія групы, сэкцыі пры сельсавеце, сэкцыі РСІ, групы садзейнасьці РСІ, насьценгазэты, групы лёгкай кавалерыі.

Каштоўны вопыт мы маем у рабоце дэпутацкіх груп, якіх у нас тры: першая — пры калгасе імя **Дзяржынскага**, другая — пры калгасе **«Чырвоны працаўнік»**, трэцяя — **у вёсцы Макраны.**

Цікава спыніцца на тым, як першая дэпутацкая група ўцягнула ў калгас аднаасобніка **Сенюка Прохара** (55 год). Пачалося гэта з простай гутаркі аб прамове тав. Сталіна па вёсцы калгасьнікаў-ударнікаў. Праз некалькі дзён **Сенюку**, як члену сельсавету, была даручана работа па адводзе зямлі для аднаасобнікаў. Што зрабілася з Сенюком — мы і самі спачатку не разумелі. Хадзіў Сянюк устурбаваны, усхваляваны, некалькі дзён ня браўся за работу. Прыдзе ў сельсавет, сядзе, уздыхне і зноў маўчыць. Нарэшце прыйшоў і катэгарычна адмовіўся ад даручанай працы па адводзе зямлі аднаасобнікам. Чаму?

— Не хачу быць аднаасобнікам. Пайду сам у калгас.

І ён прыйшоў у калгас і разам з сабой прывёў усю сваю дзесяцідворку, якой ён павінен быў адвесьці зямлю. Цяпер Сянюк Прохар — старшы конюх у калгасе, за сваю старанную, добрую работу быў прэміяван некалькі разоў. Сянюк Прохар, уцягнуўшыся ў работу дэпутацкай групы (мы яго прымацавалі да вёскі Новаселіцы), правёў там вялікую работу. Новаселіцы першымі ў сельсавеце скончылі сяўбу.

Дэпутацкая група (у в. Макраны) на чале з членам сельсавету **Сенюком Макарам** складаецца з 6 чалавек. Тут мы маем лепшыя ўзоры таго, як трэба арганізоўваць масы вакол важнейшай задачы партыі — барацьбы за якасьць сяўбы. Група сістэматычна **заслухоўвала** справаздачы членаў сельсавету аб ходзе барацьбы за якасьць, прымацавала да кожнай дваццацідворкі настаўнікаў і актывістаў для правядзеньня масавай работы сярод аднаасобнікаў.

Добра наладзіла работу аграўпаўнаважаных па дзесяцідворках (такія аграўпаўнаважаныя ў нас ёсьць у кожным пункце). Што рабілі гэтыя аграўпаўнаважаныя? Яны даводзілі да кожнай гаспадаркі аграмінімум. У часе падрыхтоўкі да сяўбы аграўпаўнаважаныя хадзілі па дворах, правяраючы колькасьць і якасьць насеньня. Пры гэтым яны былі самымі рупліўымі разьведчыкамі. Дзякуючы ім, сельсавет своячасова рэагаваў на кожны факт ігнараваньня аграмінімуму. У вёсцы Макраны аграўпаўнаважаны **Сянюк Іван** правёў вялікую масавую работу па зьнішчэньні межаў паміж палосамі. Макраны першыя зьнішчылі межы. Аграўпаўнаважаныя хадзілі па палёх, правяраючы якасьць глебы і засеву, па іх зводках аб якасьці сяўбы сельсавет мог своячасова рэагаваць на тое ці іншае зьявішча.

Дапамаглі нам і насьценгазэты. Наша насьценгазэта **«Ленінскі шлях»**, якая выходзіць пры сельсавеце, зрабілася сапраўдным арганізатарам і кіраўніком штодзённак у калгасах. Па яе ініцыятыве і дапамозе сталі сістэматычна выходзіць насьценгазэты: «Ударнік» у калгасе «Чырвоны працаўнік», «Штурмоўка» ў калгасе імя Дзяржынскага, «Ударнік калгаснага поля» ў калгасе «Чырвоны працаўнік») на чале з брыгадзірам калгасу **Ярошам** правяла вялікую масавую работу сярод аднаасобнікаў, уцягнуўшы ў калгас 8 гаспадарак у часе веснавой сяўбы.

Трэцяя дэпутацкая група (у в. Макраны) на чале з членам сельсавету **Сенюком Макарам** складаецца з 6 чалавек. Тут мы маем лепшыя ўзоры таго, як трэба арганізоўваць масы вакол важнейшай задачы партыі — барацьбы за якасьць сяўбы. Група сістэматычна **заслухоўвала** справаздачы членаў **сельсавету** аб ходзе барацьбы за якасьць, прымацавала да кожнай дваццацідворкі настаўнікаў і актывістаў для правядзеньня масавай работы сярод аднаасобнікаў.

Добра наладзіла работу аграўпаўнаважаных па дзесяцідворках (такія аграўпаўнаважаныя ў нас ёсьць у кожным пункце). Што рабілі гэтыя аграўпаўнаважаныя? Яны даводзілі да кожнай гаспадаркі аграмінімум. У часе падрыхтоўкі да сяўбы аграўпаўнаважаныя хадзілі па дворах, правяраючы колькасьць і якасьць насеньня. Пры гэтым яны былі самымі рупліўымі разьведчыкамі. Дзякуючы ім, сельсавет своячасова рэагаваў на кожны факт ігнараваньня аграмінімуму. У вёсцы Макраны аграўпаўнаважаны **Сянюк Іван** правёў вялікую масавую работу па зьнішчэньні межаў паміж палосамі. Макраны першыя зьнішчылі межы. Аграўпаўнаважаныя хадзілі па палёх, правяраючы якасьць глебы і засеву, па іх зводках аб якасьці сяўбы сельсавет мог своячасова рэагаваць на тое ці іншае зьявішча.

Дапамаглі нам і насьценгазэты. Наша насьценгазэта **«Ленінскі шлях»**, якая выходзіць пры сельсавеце, зрабілася сапраўдным арганізатарам і кіраўніком штодзённак у калгасах. Па яе ініцыятыве і дапамозе сталі сістэматычна выходзіць насьценгазэты: «Ударнік» у калгасе «Чырвоны працаўнік», «Штурмоўка» ў калгасе імя Дзяржынскага, «Ударнік калгаснага поля» ў калгасе «Чырвоны працаўнік»

КРАЦЭР
САКРАТАР РК КП(б)Б

ШЛЯХІ ДА ПЕРАМОГІ

Раёны БССР спаборнічаюць з раёнамі Заходняй вобласьці ў барацьбе за своячасовае і добраякаснае праведзеньне веснавой сяўбы. Наш Чырвона-Слабодскі раён з посьпехам выконвае ўмовы гэтага спаборніцтва. На 20 мая раён засеяў **15.917 га замест 15.800 га (100,7 проц.),** перавыкаўшы пляны сяўбы па асноўных культурах (авёс 102 проц., бульбы 110 проц.).

У гэтую вясну план сяўбы выканан на 13 дзён раней, чым у мінулым годзе, пры значна лепшай якасьці апрацоўкі глебы і задзелцы насеньня.

Спалучыць барацьбу за тэмпы з барацьбой за якасьць—такая была задача. На выкананьне яе была мабілізавана партыйная арганізацыя, камсамол, калгасьнікі і аднаасобнікі раёну. Рашаючым зьвяном у выкананьні гэтай задачы была брыгада, рапаючай фігурай—брыгадзір.

Мы арганізавалі спаборніцтва 105 брыгад раёну, палярызаваўшы даўшы кожнай брыгадзе зьвыворчае заданьне па сяўбе і ўсё неабходнае для яго выкананьня (участкі па ўсіх палёх севазвароту, інвентар, насеньне, фураж).

Барацьбу партарганізацыі за якасьць і тэмпы сяўбы лепш за ўсё праверыць на вопыце **Бучацінскай парт'ячэйкі.**

Ячэйка складаецца з 6 членаў і 14 кандыдатаў партыі, з іх у калгасах працуюць 8 чалавек, з якіх трое—старшыні калгасаў, адзін—брыгадзір, адзін—загад чык фермы, астатнія—на вытворчасьці. Ячэйка на час сяўбы дала кожнай брыгадзе парторга, скарыстаўшы і раённы актыў, прыхаваны на дапамогу для работы ў брыгадзе.

За перыяд сяўбы на калгасе імя **Войкава, Бучацінскага** сельсавету, выпушчана 42 нумары брыгаднай газэты—па 7 нумараў на брыгаду і 9 нумароў агульнакалгаснай газэты. На калгасе «Прамень», гэтага-ж сельсавету—47 нумароў, (па 14 нумароў на брыгаду).

Калгас імя **Варашылава**, гэтага-ж сельсавету, мае каштоўны вопыт палітмасавай работы: там у кожнай брыгадзе ў часе сяўбы праведзена па 8 палітгадзін, як правіла, пасьля работы адбываліся вытворчыя нарады(10-15 хвілін) па абгаварэньні вынікаў работы і заданьня на заўтра. Бучацінская парт'ячэйка цэнтр цяжару ўсёй сваёй работы сапраўды перанесла ў калгасную брыгаду. 5 мая брыгада № 2 (брыгадзір Кедрык) выявіла, што ў першай брыгадзе (брыгадзір Аляшкевіч) авёс забараванае дрэнна. Увечары з гэтай прычыны сталі біць трывогу ўсе брыгадныя газэты. Бы ла выпушчана агульнакалгасная газэта, спэцыяльна прысьвечаная гэтаму пытаньню. Ячэйка дала ў гэтую брыгаду новага парторга, паслала туды сакратара камсамольскай ячэйкі Пятровіча, прымацавала да брыгады камсамольца-настаўніка Сенюка. У выніку—брыгада вышла з прарыву. Калгас у цэлым скончыў сяўбу 19 мая, засеяўшы 172 га бульбы выключна па гаі і 150 га аўса.

Вялікую работу партыйная ячэйка правяла сярод аднаасобнікаў. У выніку калгас вырас за час сяўбы на 50 гас. падарак.

Парт'ячэйка ўмела арганізавала работу па разгорнутаньні ў часе сяўбы сацыялістычнага спаборніцтва Бучацінскага

сельсавету з Смаліцкім. На прыкладзе калгасу «КІМ» (Смаліцкі сельсавет) і «Прамень» (Бучацінскі сельсавет) мы маглі пераканацца, як сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва стала здабыткам шырокіх мас калгасьнікаў, кожнага калгасьніка паасобку. На працягу сяўбы чатыры разы брыгады абгаварвалі ход выкананьня пунктаў дагавору сацспаборніцтва. Яны выстаўлялі свае пікеты, тры разы правяралі якасьць сяўбы.

Вопыт барацьбы за сяўбу ў аднаасобным сэктары мы маем па **Макранскім сельсавеце, які сяўбу скончыў 10 мая, у Старчыцкім і Вялевіцкім сельсаветах,** скончыўшых сяўбу 16 мая. Макранскі сельсавет, разьбіўшы насьцілічы на дзесяцідворкі, даў кожнай дзесяцідворцы аграўпаўнаважанага. Арганізаваная депутацкая група ажывіла работу сэкцыі пры сельсавеце, своячасова перадаўшы ўсім аднаасобнікам абавязацельствы па сяўбе, па пастаўцы абожжа і бульбы. Там удала быці праведзены канферэнцыі аднаасобнікаў—ударнікаў, на якіх даводзіліся да мас пастановы спецыяльнага пленуму ЦК і ЦКК, прамова тав. Сталіна, і было шырока разгорнута спаборніцтва паміж дзесяцідворкамі.

Некалькі мо**мантаў** аб нашым вопыце барацьбы за якасьць сяўбы.

У калгасе **«Чырвоная Ніва»** ў брыгадзе ўвесвен інструктар іншэктарыі РСІ на якасьці—скажаль, гэты вопыт толькі ў канцы сяўбы перанесен у іншыя калгасы.

Як правіла, брыгада ў брыгады правярала якасьць сяўбы (Нараджэньне сацыялізму», «Камунар», «Перамога», і іншыя калгасы). Дэпутацкія групы сельсавету, аграўпаўнаважаныя, сэкцыі РСІ—усе яны ў аснову сваёй работы пакладзі барацьбу за якасьць.

Аб нормах выпрацоўкі і конях. Гэтая работа шла па лініі падбору конюхаў, па лініі мабілізацыі фуражных рэсурсаў, па лініі дыферэнцыяваных норм выпрацоўкі для асобных груп коняй і пастаноўкі для адпачынку.

У барацьбе за хлеб, за бульбу, за пляны заготовак мяса і масла (а мы іх поўнасьцю выканалі) партарганізацыя правяла вялікую работу па самаачыстцы ад перараджэнцкіх элементаў, мабілізавала клясавую пільнасьць партарганізацыі, камсамолу і беспартыйнага актыву, нанесла рапучы ўдар кулаку, яго агентуры, сабатажніку і спекулянту.

Другая прадпасылка—гэта своячасовае ўручэньне калгасам і аднаасобнікам абавязацельстваў па пастаўцы абожжа і бульбы дзяржаве і кантрактацыі ільну.

3-я прадпасылка—гэта вялікая масавая работа, праведзеная па лініі шырокіх тоўкі да сяўбы—зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў, курсы і зьлёт брыгадзіраў, канферэнцыі аднаасобнікаў, раёнрадуўка адозвы калгасьнікаў-ударнікаў па брыгадах, дзесяцідворках, канферэнцыя аграўпаўнаважаных рабселькораў, груп садзейнасьці РСІ.

Выступленьне тав. Сталіна па пытаньні аб рабоце на сёсцы і на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў—асноўная зброя, з якой мы выступалі ў барацьбе за сяўбу. Створаныя па пастанове ЦК УсеКП(б) палітаддзелы ў МТС і саўгасах уносілі новы жывы струмень у практыку нашай работы, увяляці аўтарытэт МТС, замацавалі яе толькі вытворчае, але і палітычна-гаспадарчае кіраўніцтва МТС калгасамі.

Асноўны вынік: посьпех сяўбы рашыла брыгада і брыгадзір. **Брыгада замацавалася ня толькі, як асноўная вытворчая адзінка ў калгасе, яна пачынае праяўляць гаспадарчую ініцыятыву, яна робіцца цэнтрам партмасавай работы.** Замацаваць яе для барацьбы за своячасовую і добраякасную прапоўку, прапашку і ўборку—такая чарговая задача.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)В, рэалізуючы ўказаньні правадыра партыі тав. Сталіна, мы дабіліся першых посьпехаў на фронце веснавой сяўбы, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)В будзем і далей змагацца за бальшавіцкі калгас.

Сяргей Дарожны

Праверка

Рана, на двух вазох праменеўцы зьявіліся ў калгас «КІМ». Два брыгадзіры і старшыня калгасу «Прамень» распрэглі коняй і, падзіпіўшы ім сена, моўчкі накіраваліся ў кантору. Брыгадзір кімаўскай брыгады № 2 **Качура,** угледзіўшы гэта ўсё як сьлед і скеміўшы, у чым справа, употай, агародамі накіраваўся да старшыні.

— Праверка прыехала. Камісія.

— Ну?

— Сваімі вачыма бачыў. Відаць ня верацъ нам, што ўправіліся...

— Ну гэта дармо яны, — упэўніваў старшыня, — у нас, браце, і перавыканалі яшчэ...

— Яны па якасьці хочуць, я іх ведаю, — здагадваўся Качура. Тым часам праменеўцы, абышоўшы калгас і не знайшоўшы старшыні, грузнаю хадою накіраваліся ў поле. Заўважыўшы брыгаду, завярнулі да яе.

Ня вытрымаўшы, Качура шапнуў старшыні:

— Ідуць...

— Гэта нам ня боязна, тут усё, як на далоні, няхай глядзяць...

Першы з праменеўцаў прывітаўся старшыня. За ім брыгадзіры.

— Здароў, старшыня. Прыехалі па сацдагавору.

— Здароў. Правяраць значыцца. Ну, ну, гэта мы рады... а то думалі забыліся пра нас. І чаму гэта, думаем, яны ня едуць так доўга? Ліст ўжо хацелі пасылаць, — жартаваў старшыня.

— Ты не жартуй, — абураліся праменеўцы, — паказвай, што ў вас тут ёсьць.

— Тут усё і ёсьць, — паказваў старшыня, — можаце праверыць. Дагавор з вамі мы выканалі. Гэта факт.

Шырокім узмахам рукі старшыня абвёў засеянныя калгасныя участкі 1-й і 2-й брыгады. Два кімаўскія брыгадзіры **Качура і Ганчар,** якія сталі тут-жа, ля свайго старшыні, перакапальна дадавалі:

— Дагавор выканалі, гэта бяз сумненьня.

— А гэта мы—пабачым, — недаверліва кідалі праменеўцы, — пабачым... Сваё кожны хваліць...

— Нам што, работа сама скажа, — задзёрыста ўклініваўся ў спрэчкі Качура, — мы засеялі раней тэрміну...

— А мы па якасьці за тое лепш, — настойвалі праменеўцы.

Спрэчкі пачыналі разгарацца. Гурт кімаўцаў абступаў камісію і ў спрэчках ад гулу галасоў нельга было ўжо разабраць, хто аб чым хацеў сказаць. Праменеўцы знаходзілі памылкі, кімаўцы з усёю ўпартасьцю апраўдваліся. Тады Гарбач адклікаў у бок старшыню «КІМУ» і нездаволена прабурчэў:

ТАВ. ГАРБАЧ — СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ «ПРАМЕНЬ».

— Умову з вамі па спаборніцтву мы, канешне, падпісалі... Тады-ж мы і спаборніцтва паставілі ў слёзе паміж брыгадамі. Гэта факт. У кожнай брыгадзе энтузіязм і адвага. Такасама газэты брыгадныя выпушчаліся сумленна, таму і сяўбу на першым слове скончылі... Наш камсамол працаваў, ня то што... Гэта факт.

— Гэта нам вядома, — перабіў Гарбач, — ты нам кажы фактычна...

— Гэта і ёсьць фактычна, — выступіў наперад старшыня «КІМУ», — дваццаць газэт выдалі? Выдалі. Сацспаборніцтва паміж асобнымі калгасьнікамі разгарнулі. Разгарнулі! Раней тэрміну скончылі сяўбу? Скончылі. Працавалі добра. Значыцца, у чым справа?

— А ў тым, — настойвалі праменеўцы, — што пакажы нам газэты.

— Паказаць можна, мы не ганарлівыя, — згаджаўся старшыня, — гэта можна...

Кіну пасеўных брыгадных газэт, якія падаў рахункавод, разабралі па аднэй. Чыталі ўважліва і ўдумліва. Відаць было, што брыгадная газэта адыграла не малую ролю ў часе веснавой калгаснай сяўбы. У спаборніцтва ўключыліся ня толькі брыгады, але і асобныя калгасьнікі.

Праменеўцы разгортвалі газэты і ўніклива зачытваліся. Вось калгасьніца камсамолка Тамашэўская выклікае спаборнічаць калгасьніц Бараноўскую і Галько Надзю. Тамашэўская абавязуецца быць дысцыплінаванай, а 5 гадзіне выходзіць на поле, перавыконваць нормы па колькасьці і якасьці. У другім нумары газэты цэлы рад новых выклікаў.

Тут-жа побач намалёваны абібок, які прагуляў два дні, ня выходячы на работу. Разглядаючы гэты малюнак, праменеўцы ўсьміхаліся і жартавалі:

— Гэта яго напэўна недасеўкі і агрэхі на бульбінчы, па твару відаць...

Прысутныя сьміяліся.

Скончыўшы агляд палёў і праверку сацдагавору паміж калгасамі, праменеўцы заклікалі кімаўцаў да сябе:

— У вас праверылі, цяпер прыяжджайце да нас.

На развітаньне з праменеўцамі кімаўцы каля вазоў дамаўляліся:

— Так што заўтра і чакайце. Прыедзем дасьвету. Мы народ сур'ёзны...

— Будзем бачыць, кідаў Гарбач, усаджваючыся на возе. — Заўтра пабачым.

Коні ірвануулі і вазы праменеўцаў гулка загрукацелі па дарозе. Доўга яны ўзьнімалі жоўтыя слупы пылу над буйным залівам раньніх усходаў, покуль ня зьніклі.

СЯКЕРЫЧ
Брыгадзір калгасу „Прамень"

Аб маей брыгадзе

У маёй брыгадзе—53 чалавека. Наша заданьне па сяўбе—69,16 га. Заданьне не малое. Вызначаную плошчу арыны засеялі і яшчэ больш. Замест 13,83 га —засеялі 18 га. Усяго арыны засеялі 74 га.

Як мы выконвалі заданьне?

Па-першае, да кожнага калгасьніка я давёў заданьне, нормы выпрацоўкі. Асабліва калгасьнікаў з вучоткамі на палёх севазвароту, якія былі прымацаваны да брыгады. Кожны калгасьнік маёй брыгады загадзя ведаў, якую працу, у якой колькасьці і калі як пазнёй выканаць, з якім інвентаром, з якімі коньмі даведзецца яму працаваць.

Наша брыгада спаборнічала з першай брыгадай, кожны калгасьнік спаборнічаў адзін з другім. Толькі дзякуючы гэтаму сяўба з першых-жа дзён пайшла шпаркa ў гару. На кожным кроку адчувалася, што ўвесь калгас і кожны калгасьнік змагаюцца за пярэдзінства. Асабліва гэта выявілася ў часе ворыва і сяўбы бульбы.

Норма па ворыве была вызначана ў 0,70, а мы сваёй брыгадай давалі 0,89 і 0,90 га за дзень на кожнага чалавека. Ніводная арэоку, зямля, як цуг—вось наша задача і мы яе выконвалі.

Асабліва ўважліва адносіліся мы да каня. Цікавым моманты былі ў нашай рабоце. У часе вялікодных сьвят. Большая частка сьвядомых калгасьнікаў адразу выйшлі на работу. Астатнія, пазіраючы на першых, урэшце таксама прышлі на поле і працавалі аж да самой ночы.

Наша брыгада выпусьціла 18 штодзённак. Штодзённікі зьявіліся ў маёй працы лепшымі дапаможнікамі ў барацьбе за якасьць сяўбы. У газэтах пісалася аб лепшых ударніках і тых, хто ганебна цягнуў брыгаду назад. Ва ўдарніку мы ставілі ня проста для фазону, а тых, якія сапраўды паказвалі тэмпы і якасьць. Вось некаторыя з нашых герояў: —Рыгаровіч Мікола, Лапушка Мар'я, Палашка Волька, Алеся Чайка. І ой-жа, як моцна дзейнічала газэта, калі зьмяшчала каго небудзь на чорную дошку! Назаўтра-ж зусім іншая праца была. Тыя, што адставалі ўчора, паступова выходзілі на першыя пазыцыі.

У часе перапынкаў у брыгадзе штодзень рабілася інфармацыя аб тым, як ідзе сяўба ў суседніх калгасах, асабліва ў калгасе «КІМ», з якім мы спаборнічаем. І гэта добра ўплывала на работу, так рупна працаваць пачалі, што проста на дзіва! Штодзень, ў вечары мы праводзілі вытворчыя нарады, дзе абгаварвалася якасьць і тэмпы праведзенай работы, дзе абгаварвалі заданьне на заўтрашні дзень.

Добра была пастаўлена ў нашай брыгадзе масавая работа. Што дзень праводзіліся палітгадзіны, у часе якіх мы знаёміліся з навінамі ў газэтах, пра падзеі ў Кітаі, аб фашысцкім тэроры ў Германіі. Праводзіліся і такія цікавыя рэчы як чытка вершаў Дзем'яна Бедного «Как дед Федул бога надул». Гэта ду жа ўзьнімала настрой калгасьнікаў.

Выходзілі на працу рана, ледзь зоры займецца, а конюхі дык яшчэ раней уставалі.

Так мы скончылі сяўбу 16 мая. А зараз з такой-жа энергіяй пераключыліся на скачаньне барановаваньня бульбы, на праполку шпаніцы.

С. РАКІТА

БРЫГАДЗІР СЯКЕРЫЧ

Брыгада Васіля Сякерыча в калгасу «Прамень» за 12 дзён першай скончыла веснавую сяўбу, даўшы добрую якасьць.

Вясновае раніцы
Сьціплая шэрань
Шчэ хутае поля
Бязьмежны прасьцяг.
Выходзіць на поле
В брыгадай Сякерыч
Ярыны апошні
Вагон заараць.

———

І вецер як песьня
Вячэрняя несьціць
Смуглявыя твары
Руплівых людзей.
— Нам сьцяг перамогі
З пашанаю несьці...
Размову з брыгадай
Сякерыч вядзе.

———

І раптам засмуглены
Твар загарыцца.
Трапеткая радасьць,
Як шустры мароз,
Праскочыць па жылах.

———

Ён ведае—дужыя
Хлопцы ў брыгадзе,
На сілу і тэмпы—
Адзін у адзін;
Яны папрацуюць
На славу, на радасьць,
Каб першымі выйсьці
На фронце сяўбы.

———

Брыгадны вучастак
Ляжыць паўз балота.
— Тут грэчку засеем,—
Апошні вагон.
І як па камандзе—
У спорнай рабоце
І людзі, і коні
Пашлі на ўдагон.

———

Вясновага вечару
Вохкая шэрань
Спаўзае на поля
Шырокі прастор.
Ідзе да праўленьня
Калгасу Сякерыч
Сказаць пра работу
І дужы напор.

———

Сказаць, што ўдалыя
Хлопцы ў брыгадзе,
На сілу і тэмпы—
Такіх пашукай;
Яны працавалі
На славу, на радасьць,
Багаты каб восеньню
Быў ураджай.

Калгас «Прамень»,
Чырвона-Слабодзкага раёну.

ЛУК'ЯНОВІЧ

ПАРТОРГ У БРЫГАДЗЕ

Пад'яжджаючы да калгасу **«Бальшавік», Жыліхаўскага сельсавету,** перш за ўсё бачым вялікую калгасную стайню. У 15—20 кроках ад стайні стаіць стол, вакол яго лаўкі. Тут-жа зроблена новая буджа і павешаны ходзікі. На дзьвярох стайні — штодзённыя брыгадныя газэты, кошкі сацыялістычнага спаборніцтва, плякаты і лёзунгі. Гэта — месца правядзеньня партмасавай работы.

А 5 гадзіне раніцы пачынаецца жыцьцё на пляцоўцы ля стайні. Калгасьнікі, якія прышлі за конямі, і ўсе астатнія садзяцца на лаўкі. Пачынаецца 15-мінутная «зарадка». Сакратар партыйнай ячэйкі тав. **Карнацкі** сам, або хто-небудзь з іншых камуністаў - настаўнікаў праводзяць палітгутарку на міжнародныя тэмы, растлумачваюць пастановы аб абавязковай настаўцы вбожжа і бульбы дзяржаве, прапрацоўваюць газэтны матар'ял аб працы перадавых брыгад і калгасаў па правядзеньні веснавой сяўбы.

Увечары, пасьля працы, на гэтых-жа самых лаўках — вытворчыя нарады брыгад. Тут падводзяцца вынікі скончанага дня, абгаварваецца якасьць выкананьня работы кожным звяном брыгады, кожным калгасьнікам паасобку. Позна ўвечары рэдкалегія што дзенак вывешвае на дзьвярох стайні новыя сьпісы ўдарнікаў і прагульшчыкаў.

Трэба сказаць, што праводзімая партыйна-масавая работа проста ўжаралася ў быт калгасьнікаў, увайшла ў сыстэму работы партыйнай і ячэек у калгасах БССР.

Камсамольскай ячэек у калгасе «Бальшавік».

Бучацінская парт'ячэйка ў калгасе імя Войкава ў кожнай брыгадзе вылучыла партыйнага арганізатара і агітатараў. На абавязку партарганізатара ляжыць адказнасьць за якасьць партмасавай работы, за якасьць брыгаднай працы. Асабліва добра працаваў у часе сяўбы кіраўнік партгрупы калгасу імя Войкава **Страленя,** які кожны дзень увечары інструктаваў і даваў заданьні аб працы парторгаў на заўтрашні дзень. Як і ў калгасе «Бальшавік», тут парторгі перад самым выхадам у поле ў 5 гадзін раніцы праводзілі 15-мінутныя палітзарадкі, адначасова інструктавалі агітатараў, як праводзіць агітацыйна-масавую працу па зьвеньнях брыгады. Увечары зьвеньнявыя агітатары, разам з кіраўнікамі зьвеньняў падводзілі вынікі па выкананьні заданьня зьвяна за дзень, а потым парторгі разам з брыгадзірамі падводзілі вынікі работы брыгады на брыгадных вытворчых нарадах. Лепшыя прыклады работы паказалі групавыя агітатары (брыгады Шаўлыка)—**Вярценя, Аляшкевіч З. і Кулеш М.**

Партмасавая праца, якая праводзілася парторгамі і зьвеньнявымі агітатарамі, знайшла практычнае ажыцьцяўленьне ў радзе перадавых калгасаў нашага раёну: «Чырвонай зоркі», «Пуцілаўцы», «Дзяржынскім», «Перамозе». Гэты вопыт павінен стаць здабыткам у працы ўсіх парт'ячэек у калгасах БССР.

Дзяржаўнаму Беларускаму Тэатру Опэры і Балету—гарачае прывітаньне!

СТВАРЭНЬНЕ ТЭАТРУ ОПЭРЫ і БАЛЕТУ—НОВЫ ЎКЛАД У ВЯЛІЗАРНЫЯ ПЕРАМОГІ НА ФРОНЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР

Творчая група тэатру

IV акт оп. „Кармэн"

Эпізод II акту

Эпізод III акту

Лепшым ударнікам—пачэсная грамата НКА БССР

Тав. І. А. Гітгарц—заслужаны артыст рэспублікі

(З пастановы калегіі Наркамасьветы БССР ад 23 мая 1933 г.)

Калегія НКА лічыць неабходным падкрэсьліць вялікую работу ўсяго калектыву тэатру Опэры і Балету на працягу ўсяго падрыхтоўчага пэрыяду, і на гэтым грунце пастанаўляе:

— Тав. ГІТГАРЦУ І. А. дырэктару, мастацкаму кіраўніку і галоўнаму дырыжэру тэатру Опэры і Балета, за выключную энэргічную работу і высокаталенавітую музычна-дырыжэрскую твор часьць надаць годнасьць ЗАСЛУЖАНАГА АРТЫСТА РЭСПУБЛІКІ.

Т. т. АЛЕКСАНДРОЎСКУЮ, БАНАЧЫЧ, БАЛОЦІНА, ГУЛЬМАНА, БАРЫСЭВІЧ, ДЗЯНІСАВА, КРАМАРЭЎСКАГА, КАЛІНОЎСКАГА, НІКІЦІНУ, ПЯТРОВА, РУСІНА, САЛІНУ і ПІГУЛЕЎСКАГА—узнагародзіць пачэснымі граматамі НКА БССР, як лепшых ударнікаў па стварэньні Беларускага Дзяржаўнага Тэатру Опэры і Балету.

Калегія НКА, вітаючы калектыў працаўнікоў тэатру, упэўнена ў тым, што ў бліжэйшы час тэатр здолее даць высока-мастацкія паказы, якія-б адбівалі рэчаіснасьць нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Нам. наркома асьветы БССР
РУДНІЦКІ.

Вялікая перамога ў нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР

Адкрыцьцё Беларускага Дзяржаўнага Тэатру Опэры і Балету бясспрэчна вялікая перамога ў нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР. У гэты асаб ліва выдатны дзень шлю калектыву опэры і балету шчырае пажаданьне посьпехаў у далейшай творчай рабоце.

Упэўнен, што настомны энтузіяст тав. ГІТГАРЦ, стварыўшы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Беларускі Дзяржаўны Тэатр Опэры і Балету, забясьпечыць опэрнаму майстэрству высокія ўзоры мастацкай творчасьці.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук
П. ГОРЫН.

Мацнейшая зброя пралетарыяту

Сэктар мастацтва НКА РСФСР вітае адкрыцьцё Беларускага Тэатру Опэры і Балету, які зьяўляецца мацнейшай зброяй пралетарыяту ў галіне палітычнага і мастацкага выхаваньня мас. Жадаем плённай работы ў справе стварэньня магнітабудаў савецкага мастацтва нацыянальнага па форме, сацыялістычнага па зьмесьце.

Член калегіі НКА РСФСР
Заг. сэктару мастацтва АРКАДЗЕЎ.

Ад Вялікага тэатру СССР

Менск, Тэатр Опэры і Балету

ВЯЛІКІ ТЭАТР СССР ВІТАЕ ВАС З АДКРЫЦЬЦЁМ І ЖАДАЕ ПЛЁННАЙ РАБОТЫ Ў СПРАВЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ ОПЭРНАГА І БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА.

ДЫРЭКЦЫЯ, ЯЧЭЙКА, МЯСЦКОМ.

Прывітаньне ад тэатру імя Няміровіча-Данчанка

Менск, Дзяржаўнаму Опэрнаму Тэатру

Брацкую рэспубліку, якая ўзбагацілася дзяржаўным опэрным тэатрам і калектывам работнікаў тэатру, сардэчна вітае і жадае посьпеху і цеснай сувязі з пралетарскімі масамі ТЭАТР ІМЯ НЯМІРОВІЧА-ДАНЧАНКА.

Несьці ідэі Леніна і Сталіна ў гушчу працоўных мас!

У той час, калі ў капіталістычных краінах наглядаецца поўны заняпад буржуазнай культуры, калі ўзброены фашызм драпежна топча ўсё лепшае, набытае дагэтуль чалавецтвам, зьнішчае на сярэднявяковых вогнішчах геніяльныя творы клясыкаў тэорыі навуковага сацыялізму, думаючы гэтым затрымаць кола гісторыі, затрымаць рэвалюцыйнае наступленьне сусьветнага пралетарыяту, — працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей СССР пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на чале з тав. Сталіным пераможна, небачанымі тэмпамі і ў небачаных маштабах будуюць сваю культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце, стварэньне магнітабуды мастацтва.

Сапраўды: стварэньне такога буйнага, поўнацэннага, творчага арганізму, як калектыў Дзяржаўнай Опэры і Балету, хіба не зьяўляецца найбольш яркім доказам творчай магутнасьці бальшавіцкай партыі, савецкай улады, пралетарыяту.

Сьвяткуючы сёньня з усімі працоўнымі БССР гэтую буйнейшую, сапраўды бальшавіцкую перамогу, мы, работнікі БДТ-І, ганарымся павялічэньнем нашых радоў на фронце мастацтва такім субратам, якім зьяўляецца малады Беларускі Дзяржаўны тэатр Опэры і Балету.

Мы ня можам у гэты дзень не адзначыць і вялікую работу дырэктара тэатру тав. Гітгарца — таленавітага мастака і арганізатара.

Мы заклікаем вас, таварышы: пад кіраўніцтвам ленінскай партыі несьці і надалей ідэі Леніна і Сталіна ў гушчу працоўных мас.

Калектыў БДТ-І.

Прывітаньне Адэскага Опэрнага Тэатру

Дырэктару ГІТГАРЦУ

Вітаем вас з перамогай на культурна-мастацкім фронце. Вашы дасягненьні, як і нашы, зьяўляюцца дасягненьнямі рабочае клясы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў справе будаўніцтва нацыянальнай сацыялістычнай культуры. Жадаем посьпеху.

Дырэктар КУДРЫН.

ІЛЬЯ ГІТГАРЦ

ДЗЕЦІШЧА ПЯЦІГОДКІ

На падставе выключна бурнага росту вытворчых сіл і сацыялістычных вытворчых адносін, квітнее культура і мастацтва сацыялістычная па зьмесьце, нацыянальная па форме. Вялізарнейшыя дасягненьні культурнай рэвалюцыі ў БССР — лепшы доказ правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, няўхільна і цьвёрда праводзімай нашай КП(б)В, якая здолела за гэты час пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), пры брацкай дапамозе СССР ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, стварыць тысячы ВНУ, узьняць мастацтва на нябачаную вышыню.

Сёньня адкрываецца беларускі тэатр опэры і балету. Гэта азначае яшчэ адно буйнейшае чарговая перамога рабочай клясы БССР на фронце культурнай рэвалюцыі. Гэта азначае, што пастанова ЦК КП(б)В аб адкрыцьці ў 1933 годзе опэрнага тэатру — выкананa.

На працягу 2 з пал. год калектыў беларускай дзяржаўнай студыі опэры і балету (створаны 5 кастрычніка 1930 г.) пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі, сацыялістычнымі мэтадамі працы праводзіў усю сваю палітычную і творчую вучобу, змагаючыся з старымі, гнілымі традыцыямі опэрнай спэцыфікі—«вампукай», адначасова вядучы бязьлітасную барацьбу за правільнае разуменьне крытычнага выкарыстаньня і пераапрацоўкі лепшых клясычных твораў.

Самы факт заснаваньня ў 1930 годзе студыі опэры і балету сустрэў шалёнае супраціўленьне з боку варожых нам элемэнтаў. Яны стараліся ўсякімі спосабамі і сродкамі падарваць працу маладога калектыву. Добра разумеючы, што гэты калектыў студыйцаў, пойдзе па шляху стварэньня такой мастацкай адзінкі, якая-б зьяўлялася вострай зброяй у руках пралетарыяту будуючага сацыялізм.

Нельга прайсьці міма тых ганебных фактаў, якія мелі месца з самаго пачатку існаваньня студыі, калі паасобныя «дзеячы» мастацтва амаль цалкам падпадалі пад уплыў варожых нам элемэнтаў, папыраючы «гутаркі» аб тым, што ва ўмовах БССР няма магчымасьці набудаваць такую вялікую мастацкую адзінку, якой зьяўляецца вышэйшая форма музычнага мастацтва—опэра. Што, так сказаць, «узяліся не за сваю справу», што «няма ў нас кадраў, а калі ёсьць, дык надзвычай нізкія па сваёй якасьці». Зусім зразумелым зьяўляецца, што гэтыя «гутаркі» — ёсьць лэйтматыў вялікадзяржаўніцкага хору. Былі і такія «фінёзафы» з лягеру контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія сьцьвярджалі, што опэра будзе тады сапраўды беларускай, калі сьпеў будзе суправаджацца ў опэры з аркестру, складзенага выключна з цымбал, жалейкі, дуды, леры.

З боку паасобных адказных прапаўнікоў, працуючых па музычнай галіне, у часе падрыхтоўкі выпуску першай пастаноўкі студыі опэры «Залаты пеўнік» (1930 год) мелі месца гутаркі, што калектыў студыі ні ў якім разе ня здолее перамагчы такі надзвычай складаны музычны твор, якім зьяўляецца опэра «Залаты пеўнік», што студыя займаецца ашуканствам пралетарскай грамадзкасьці, што пастаноўка ня пойдзе. У часе падрыхтоўкі опэры «Кармэн» (1932 год) «вялікадумныя вучоныя» стараліся даказаць, што нельга займацца пераапрацоўкай опэры «Кармэн», пры чым не саромяліся даваць «прароцтва», што ў выніку гэтай працы ў лепшым выпадку будзе халтура. У справе рэпэртуарнай палітыкі студыі мяліся выпадкі з боку некаторых даказаць, што праца над опэрай «Яўгені Анегін» ёсьць шкодная і недапушчальная зьява ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва. Тактыка разважаньні і імкненьні сарваць працу над опэрай «Яўгені Анегін» фактычна зьяўлялася настроямі «лявацкага» парадку.

Пралетарская грамадзкасьць дала адпор як па «лявацкіх» тэорыях «адміральня» опэры ва умовах сацыялістычнага будаўніцтва, так і па імкненьнях накрытычнага выкарыстоўваньня клясычных твораў са спадчыны мінулага.

Трэба адзначыць, што пастаноўка «Залаты пеўнік» Рымскага-Корсакава, пастаўленая студыяй у 1931 годзе, мае бязумоўна цэлы рад памылак фармалістычнага і эстэтычнага парадку. Але адначасова трэба падкрэсьліць тую вялікую карысьць, якую дала праца над опэрай «Залаты пеўнік» маладому калектыву студыі, які здолеў, бязумоўна, перамагчы надзвычай складаны музычны твор даказаўшы, што студыя мае надзвычай здольны маладняк сьпевакоў.

З усіх галін музычнага мастацтва—опэра на сёньшні дзень, бязумоўна, мае ўсе магчымасьці стаць вялізарным фактарам культурна-асьветнага і агітацыйнага значэньня. Спалучэньне такіх кампанэнтаў, як музычнае, жывое слова ў дзеяньні, харэаграфія і выяўленчае мастацтва,—дае надзвычай шырокія магчымасьці кампазытару і драматургу праз каштоўнейшую форму мастацтва, якой зьяўляецца опэра, адлюстроўваць тыя вялізарнейшыя дасягненьні, якімі так багата наша сацыялістычная рэчаіснасьць.

Да ўрачыстага адкрыцьця беларускага тэатру опэры і балету малады калектыў тэатру (былая студыя), перамагаючы ўсе цяжкасьці свайго росту, здолеў падрыхтаваць чатыры опэрных пастановак: «Кармэн» музыка Бізэ, «Апрычнікі» (Царская Нявеста) Рымскага-Корсакава, «Яўгені Анегін» Чайкоўскага, «Залаты пеўнік» Рымскага-Корсакава і харэаграфічны паказ, над сканчэньнем якога зараз вядзецца ўдарная работа, балету «Чырвоны мак», музыка Глеера.

Побач з гэтымі дасягненьнямі ёсьць цэлы шэраг недахопаў. Галоўным і асноўным з іх трэба лічыць тое зьявішча, што студыя ня здолела да канца давесьці справы па напісаньні арыгінальнай опэры, якая-б адлюстроўвала ўсю веліч нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Далёка нявыстарчальна разгорнута бальшавіцкая крытыка і сама крытыка, асабліва ў справе абгаварэньня пастановак шляхам уцягненьня шырокіх колаў пралетарскіх мас (дыспуты і дыскусіі).

Студыя была слаба зьвязана з шырокімі коламі пралетарскай грамадзкасьці. Слабая па-колькасьці партыйная і камсамольская праслойка. Нявыстарчальная праца вялася ў напрамку драматычнага выхаваньня сьпявака-актора.

Першая падрыхтоўчая работа скончана. Перад калектывам маладога опэрнага тэатру стаіць у далейшым задача яшчэ з больш энтузіязмам, яшчэ з большай энэргіяй, з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за правільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі. У другой пяцігодцы пабудовы бясклясавага грамадзтва перад калектывам тэатру стаіць задача абавязкова стварыць арыгінальную опэру і харэаграфічны паказ, якія-б праз мастацкія вобразы, музыку, адлюстроўвалі-б вялікую рэчаіснасьць нашага сацыялістычнага будаўніцтва.



Заслужаны артыст рэспублікі тав. ГІТГАРЦ.

ПРЫС І.

кіраўнік навуч часткай кансэрваторы

Буйная перамога

Адкрыцьцё Беларускага Дзяржаўнага Тэатру Опэры і Балету зьяўляецца вялізарным дасягненьнем КП(б)Б і працоўных мас Беларусі на фронце культурнай рэвалюцыі. Гэта дасягнута першай пяцігодкі, на працягу двух з паловай год свайго студыйнага існаваньня пасьпела паказаць лепшыя мастацкія ўзоры акторскага і вакальнага майстэрства, пасьпела паказаць свой палітычны твар, сваю гатоўнасьць змагацца за беларускую сацыялістычную культуру.

Пастаноўкі тэатру «Залаты пеўнік» Рымскага-Корсакава, «Кармэн» Бізэ — зьяўляюцца лепшым мастацкім атэстатам маладога тэатру, лепшым пралетарскім парывам тэатру на творчым шляху яго крытычнага скарыстаньня клясычнай спадчыны. Гэтыя пастаноўкі зьяўляліся экзаменам перад тварам пралетарскай грамадзкасьці, якая ўручыла тэатру атэстат сьпеласьці на права стаць у рады лепшых тэатраў БССР.

Грамадзкасьць пралетарскай сталіцы БССР у мінулым высока ацаніла мастацкую прадукцыю маладога тэатру і з бальшавіцкай прамотай паказала тэатру на рад недахопаў, якія не прайшлі бяз сьледу для энтузіястаў маладога тэатру.

Асноўная сіла тэатру і заключаецца ў тым, што ён з бальшавіцкай самакрытыкай падыходзіў да сваёй штодзённай тэатральнай работы, выпрацоўваючы на-ходу ня недахопы, мабілізуючы пралетарскую грамадзкасьць на ахтыўны ўдзел у рабоце тэатральнага фронту. Аб гэтым арка гаворыць факты супрацоўніцтва тэатру з буйнейшым прадпрыемствам Менску — заводам імя Молатава.

Малады тэатр за два з паловай гадоў сваёй вучобы прыйшоў да свайго адкрыцьця з цэлым радам буйнейшых мастацкіх сіл, даўшых у сваіх пастаноўках мастацкі тыпаж, высокае мастацкае вакальнае майстэрства, якое высунула высокамастацкіх выкладчыкаў як Александроўская, Салінаў, Валоціна, Калінаўскага, Дзянісава, Пігулеўскага, Русіна і інш.

Зразумела, ня можа быць і гутаркі аб тым, што тэатр ня мае цьвёрдай базы для свайго далейшага шырокага разьвіцьця. Асноўнай крыніцай, што папаўняе рады змагароў тэатральна-вакальнага фронту, зьяўляецца музычны тэхнікум, які перадаў на працягу году некалькі дзесяткаў кваліфікаваных работнікаў-вакалістаў опэрнаму тэатру.

Адзначаючы ў асобе маладога тэатру наўпасьць мастацкіх рэальных сіл, мы добра бачым свае недахопы, свае буйнейшыя хібы ў рабоце.

Тэатр адкрываецца ў рашучы момант барацьбы партыі і працоўных мас Савецкага саюзу за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, у момант ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў у эканоміцы і сьвядомасьці людзей.

Вялікія задачы 2-й пяцігодкі павінны стаць і стаюць у цэнтры ўвагі маладога тэатру.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Заслужаны артыст рэспублікі М. Рафальскі

За савецкую опэру

25 мая гэтага году спэктаклем «Кармэн» практычна ажыцьцяўляецца пастанова ўраду аб ператварэньні опэрнай студыі ў Беларускі Дзяржаўны Тэатр Опэры і Балету. У сувязі з гэтым хочацца падзяліцца некаторымі думкамі аб шляхох і задачах гэтай новай культурнай адзінкі ў сетцы нашых дзяржаўных тэатраў.

Наўрад ці можна спрачацца наконт таго, што опэра зьяўляецца найбольш складаным відам тэатральнага твору, па сваёй кампазыцыі і па рознастайнасьці прыёмаў і па тым, што яна ўключае ў сябе ўсе элемэнты тэатру ў цэлым, яна адрозьніваецца ад драматычнага тэатру і ўсіх іншых тэатральных жанраў сваімі маштабамі і сваёй сынтэтычнасьцю.

Тэатр ёсьць паогул мастацтва сынтэтычнае, мастацтва, якое ўключае ўсе віды творчасьці, пачынаючы ад літаратуры і канчаючы архітэктурай—будаўніцтвам, і разам з гэтым ён ёсьць мастацтва арганічнае, самастойнае, якое мае сваю спэцыфіку, свае асаблівасьці ня толькі ў цэлым, але і паасобных частках. Быць пісьменьнікам тэатру — гэта значыць быць пісьменьнікам своеасаблівым, пісьменьнікам асобным. Калі раман пішацца для чытаньня, дык драма пішацца для таго, каб быць паказанай у тэатры, г. зн. для таго, каб стаць адным з элемэнтаў таго шматграннага твору мастацтва, якое называецца — спэктакль.

Ня кожны мастак, як-бы ні было дасканала яго майстэрства, наколькі-б таленавіты ён ня быў, можа стаць мастаком тэатру. Для гэтага ён павінен быць тэатральным мастаком, г. зн. мастаком, які адчувае і разумее жывога чалавека ў сцэнічных рамках.

Існуе думка, што тэатр зьяўляецца мастацтвам выкапаўчым, г. зн. не самастойным, а такім, якое тлумачыць твор драматурга. Такім чынам, актор зьяўляецца толькі выканаўцам ролі, напісанай для яго драматургам, а ня творцам твору непаўтарнага, своеасаблівага. Гэта думка далёка няпрыгожая і абвяргаецца хаця-б тым фактам, што роля шэкспіраўскага Гамлета, напрыклад, у розныя часы розными акторамі гралася своеасаблівa.

Калі драматычны спэктакль зьяўляецца вялікі складаным да сваёй кампазыцыі, спэктакль опэрны; калі роля актора ў драматычным тэатры зьяўляецца роляй мастака, які павінен быць мысьліцелем, творцам, і ў той-жа час матар'ялам для сваёй творчасьці, бо матар'ялам акторскай творчасьці зьяўляецца сам актор, яго цела, яго голас, — дык роля опэрнага актора ўскладняецца яшчэ тым, што да опэры ў цэлым і да выканаўцаў опэры ў прыватнасьці прад'яўляюцца высокія патрабаваньні вакальнага і музыкальнага парадку. Драматычны актор павінен быць музыкальным і рытмічным, але для яго гэта толькі адзін з прыёмаў узьнешняня, — для опэрнага актора абавязковы ўсе тыя элемэнты, з якіх складаецца тэатр драматычнага актора плюс вакальныя і музыкальныя элемэнты, якія павінны быць даведзены да дасканаласьці, бо ў гэтым спэцыфіка і адрозьненьне опэры ад іншых відаў тэатральнага твору.

У тэрміналёгіі опэрнага актора, на жаль, яшчэ да гэтага часу захаваліся такія акрэсьленьні: «У опэры «Яўгені Анегін» я сьпяваю або выконваю партыю Анегіна». Сьпяваю, або выконваю, а ня граю ролю Анегіна, як сказаў-бы драматычны актор. У гэтым заключаецца памылка опэрнага актора, якая відзе часам да звужэньня яго функцыі ў спэктаклі, з часам нават і да штампу. Нашаму маладому опэрнаму тэатру, яго актору трэба адмовіцца канчаткова ад гэтай установы і паставіць перад сабой задачу стварэньня вобраз, які вычарпальна скарыстоўваў-бы ўсе багацьці і магчымасьці, заложаныя ў опэры.

Калі ў адносінах да мастацтва паогул, у тым ліку і да тэатру прад'яўляецца патрабаваньне быць праўдзівым, зб'ектыўна адлюстроўваючым рочаіснасьць, актывізуючым яе ў інтарэсах сацыялізму, у інтарэсах клясы, якая зьяўляецца посьбітам самых перадавых ідэалаў чалавецтва, дык опэра, не зьяўляючыся выключэньнем у гэтым сэнсе, павінна і мае ўсе магчымасьці заняць адно з першых месц у нашым савецкім мастацтве. Сацыялістычны рэалізм, найбольш выяўляючы клясавую аб'ектыўнасьць пралетарыяту, мэтаімкнёны, суровы, лякانічны стыль, стыль навальніцы і націску на ўсё, што перашкаджае і тармозіць прасоўваньне ўперад, павінен стаць стылем нашай опэры. Адмаўленьне ад усёй напышлівасьці і мішуры, якімі характарызуецца опэра фэодалаў і буржуазіі, адмаўленьне ад фальшывай пампэзнасьці і пераключэньне на вялікія сацыяльныя палотны, — вось што павінна акрэсьліваць шлях і імкненьне нашага маладога опэрнага тэатру. Як-жа вырашаецца пытаньне аб сацыялістычным рэалізьме ў опэры, у якой людзі не гавораць, а сьпяваюць? (У жыцьці-ж людзі гутараць!) Так могуць паставіць пытаньне толькі тыя, хто зьмешваюць рэалізм і «штодзённае» жыцьцё, хто не разумее, што мастацтва заклікана ня сьледаваць па пяхольніцку за «штодзённым» жыцьцём, а браць жыцьцё, г. зн. рэчаіснасьць за аснову, не адрываецца ад яе адцягненай фантастыкай і выдумкай, а кандэнсаваць яе ў мастацкія вобразы, накіроўваць гэту рэчаіснасьць і ўкладаць у яе ідэі і думкі, якія сугучны і адпавядаюць нашым патрабаваньням.

Па самым сваім характары опэра ня можа быць натуралістычнай, г. зн. пасьпяваць «жыцьцёвай», элемэнты быту ў ёй ня могуць быць зьніжаны да бытаўшчыны, усё ў яе зьявята музыкай, сьпевамі. Такім чынам і рэальнасьць подзей і канфліктаў, якія разгортваюцца ў ёй і праўдзівасьць вобразаў павінна выцякаць з правільнай ідэйнай установы і акрэсьліваецца пафасам і рамантыкай гэтай вернай ідэі. Пытаньне аб культурнай спадчыне ня толькі таму, што савецкая опэра знаходзіцца яшчэ ў пачатку свайго разьвіцьця, што яна яшчэ колькасна абмежавана і якасна не дасягнула вышынь клясычнай опэры, але і таму, што правільная трактоўка клясычнай опэры значна больш складаная, чым трактоўка клясычнай драмы. Задача спадчыны клясычных твораў у тэатры ня толькі зводзіцца да таго, каб зрабіць гэтыя творы здабыткам нашай масавай аўдыторыі (гэта таксама неабходна), але галоўным чынам да таго, каб выявіць у гэтых творах іх пратрэсыўныя пачаткі, асьвятліць іх сьветапоглядам пралетарыяту і зрабіць з іх зброю барацьбы пралетарыяту за яго ідэалы.

У музыкальным творы эмоцыі, думкі, ідэі выкананы складанейшымі нюансамі і неабходна вялікая мастацкая чуласьць, ясная і вострая думка, усебаковая культура, каб гэтыя эмоцыі, думкі і ідэі падпарадкаваць ідэям савецкай опэры. Да таго часу, пакуль опэрны актор будзе абмяжоўвацца сябе ролай сьпевака, ён гэтай задачы ня выканае. Яго вакальныя і музыкальныя магчымасьці павінны стаць рашаючымі, але не адзінымі элемэнтамі яго творчасьці. Тэхналёгія акторскага майстэрства ў цэлым рознастайная і шматгранная, што заложана ў яго матар'яле—цела, рытмічнасьць, пластычнасьць, уменьне слухаць свайго партнэра, даносіць тэму, ідэю, думку, пачуцьцё, — знаёмства з тэатральнымі школамі, з кампазыцыяй спэктаклю, з пабудовай вобразу ў спэктаклі, правільныя ўзаемаадносіны і ўзаемаадносіны з іншымі дзеячымі асобамі тэатру — вось тыя патрабаваньні, якія павінен прад'явіць да сябе опэрны актор у галіне тэхналёгіі майстэрства.

Застаецца пажадаць калектыву, — якім кіруе такі таленавіты музыкант і майстра-дырыжэр, як Ільля Гітгарц, — каб ён, (калектыў) з энэргіяй, вартай савецкага тэатру, аўладаў сваім майстэрствам і заняў належнае месца, як сярод тэатраў БССР, так і сярод тэатраў усяго Саюзу. Нельга не адзначыць і не падкрэсьліць тэй выключнай ролі, якую адыграў тав. Гітгарц, як мастак і як арганізатар у фармаваньні калектыву і опэры ў цэлым. З выключнай настойлівасьцю і матаімкнёнасьцю ён дабіваўся і заслужана дабіўся таго месца, якое опэра заклікана зараз заняць сярод нашых тэатраў. Студыйныя спэктаклі і асабліва «Кармэн» паказалі, што перад намі здольны творчы калектыў. Усё гэта гаворыць аб тым, што наш малады опэрны тэатр творча жыцьцяздольны і яму трэба прадаваць, працаваць і працаваць.

МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ даводзіць да ведама ўсіх арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў і асобных падпісчыкаў, што прыём падпіскі на газ. «Зьвязда» на чэрвень месяц ПРАЦЯГНУТ ДА 28 МАЯ.

Падпіска прымаецца бесьперапынна з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. вечара ў Менскім гарбюро Саюздруку—Ленінская, 34, 2-гі паверх, а таксама ўсім віёскамі, магазынамі Саюздруку і масавымі тыражнікамі Менгарбюро.

Менгарбюро Саюздруку.

Менгарбюро Саюздруку даводзіць да ведама ўсіх назначальных устаноў і асобных падпісчыкаў, што ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на газету «ЗА КОМПРОСВЕЩЕНИЕ» працягнут ДА 28 МАЯ і прымаецца без абмежаваньня.

Падпіска прымаецца: Ленінская, 34, 2-гі паверх, з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. вечара, а таксама масавымі тыражнікамі Менгарбюро.

Гарбюро Саюздруку.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Каса—ад 1 г. дня — Новы мастацкі фільм 5 НЯВЕСТ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. — 2-ая серыя 2-ая музычанскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка — Каса з 1 г. дня — Дзённы сэанс ШЫНЭЛЬ Гогаля у 7 част. — Вечарні сэанс гукавы фільм „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" у 2-х ч. „ШЫНЭЛЬ" Гогаля у 7 ч.

„СПАРТАК" — Каса з 3 г. 30 м. — Замежны мастацкі фільм ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ Драма у 7 част.

ПРАЛЕТАРЫ — СІЛА І ХАРАСТВО каміды у 6 частках, з удзелам Пат і Паташона